Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Центральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

10 год выданьня.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • 3 р. 70 к. • 6 • 4 р. — к. • 1 год • 8 р. — к. Вымена адрасу: іншагародніх — 30 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапарэлі наперад тэксту 1 р. — к. За радок шапарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьцепныя на 50 проц. даражэй. Знак тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 35 кап. За кожны дадатковы 15 • Беспрадук. і чырвонаармейцы за дакумант 15 • За кожны дадатковы 5 • Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 210 (2699) Субота, 14-га верасьня 1929 г.

154 кр. "Савецкая Беларусь" Одесса, Пастера 13, государ- стен. публичн. библиотека. студз. сьнеж. адзін экз.

Другое спатканьне.

ПАСЬЛЯ ДОЎГАЙ ПРАВАЛОКІ „РАБОЧЫ" МІНІСТР ІЗНОЎ ЗАПРАСІЎ ПРАДСТАЎНІКА СССР У ЛЁНДАН.

Часовы паведаны па справах Нарвегіі Даніэльсон 10 верасьня нотай на імя Літвінава паведаміў, што брытанскі ўрад прыймае да ведама заяву Літвінава, зробленую ў Маскве 6 верасьня адносна аднаўленьня зносін паміж брытанскім і савецкім урадам і прапануе да 24-га верасьня выслаць прадстаўніка ў Лёндан. Дату і месца вызначае як больш спрыяючае міністру замежных спраў дзеля спатканьня з прадстаўніком ураду СССР па прычыне гэтых перамоў і гэтай працэдуры.

Літвінаў паведаміў 12-га верасьня Даніэльсону наступнае: «урад СССР прыймае да ведама паведамленьне брытанскага ўраду, якім яно, з сасланьнем на маю заяву ад 6 гэтага месяца, запрашае Саюзны ўрад занова паслаць паўнамоцнага ў Лёндан да 24 верасьня дзеля абгаварэньня з міністрам замежных спраў у працэсе працэдуры. У адпаведнасьці з вышэйпаказанай заявай, а таксама з сваёй нотай ад 23-га ліпеня, у якой зазначалася на гатоўнасьць саюзнага ўраду да абгаварэньня ў сучасны момант выключна пытаньняў працэдуры і далейшых перамоў, а ня спрэчных пытаньняў па сутнасьці. Саюзны ўрад выражае згоду на пасылку ў Лёндан да азначанага дню прадстаўніка з адпаведнымі паўнамоцтвамі. Пэўны час у ангельскі порт прыбыцьця ўпаўнаважанага саюзнага ўраду будзе паведамлен дадаткова".

У адказ на пытаньне прадстаўніка ТАСС, ці мяркуе НК замежных спраў пастаўіць у прэзыдыуме ЦВК СССР пытаньне, якое датычыцца аднаўленьня адносін з Вялікабрытаніяй, згодна ноты брытанскаму ўраду ад 31-га ліпеня, час. вык. абав. Наркома Замежных Спраў тав. Літвінаў даў наступнае растлумачэньне: імкненьне да аднаўленьня і захаваньня нармальных адносін з усімі дзяржавамі зьяўляецца складанай часткай мірнай палітыкі саюзнага ўраду, які атрымаў неадназкроць адабрэньне ЦВК СССР і ўсесаюзных зьездаў саветаў. У інтарэсах паскораньня аднаўленьня адносін з Вялікабрытаніяй, згодна рашэньня саюзнага ўраду, прыняў сваёй нотай ад 23-га ліпеня прапанову аб папярэднім абгаварэньні пытаньняў без перамоў па спрэчным паміж абедзьвума краінамі пытаньняў, якія павінны мець месца пасьля аднаўленьня нармальных зносін.

Паколькі згодна нядаўнай заявы г. Гендэрсона ў друку і яго апошняй ноце зараз зноў ставіцца пытаньне толькі аб абгаварэньне працэдуры, НК Замежных Спраў лічыць магчымым занова паслаць дзеля гэтай мэты ў Лёндан упаўнаважанага, дзеля таго, што вырашэньне гэтага пытаньня не патрабуе дадатковых інструкцый ад прэзыдыуму ЦВК СССР.

У АПОШНІ ЧАС.

(*Атрымана а 1-ай гадзіне ўночы*).

Адказ кітайскага ўраду на прапанаваньне ўраду СССР падпісаць супольную дэклярацыю.

МАСКВА, 13-9. 11 верасьня 1929 г. Народны Камісарыят Замежных Спраў СССР атрымаў праз нямецкае пасольства ў Маскве адказ кітайскага ўраду на прапанаваньне ўраду СССР падпісаць супольную дэклярацыю. Адказ гэты наступны:

„1. Нацыянальны ўрад Кітаю неадназразова выказваў сваю гатоўнасьць пачаць перамовы з савецкім урадам з мэтай дасягненьня справядлівага і задавальняючага вырашэньня нядаўняе спрэчкі. Нацыянальны ўрад з гэтае прычыны прызначальны савецкаму ўраду за выказ з яго боку гатоўнасьці падпісаць, пасьля дасягненьня згоды між абодвума бакамі, супольную дэклярацыю, і поўнасьцю згаджаецца на тое, каб маючая адбыцца канфэрэнцыя была адчынена як мага хутчэй, каб прадстаўнікі абедзьвюх краін маглі прысьці да канчатковага ўрэгуляваньня ўсіх пытаньняў, ня вырашаных між абедзьвюма краінамі.

2. Нацыянальны ўрад не супярэчыць супроць прапанаваньня савецкага ўраду, каб у арт. 3 прадпаложанай супольнай дэклярацыі было дадзена слова «зараз-жа» праз—„рэкамэндуем", але, да жалю, ня бачыць магчымасьці згадзіцца з прапанаваньнем аб назначэньні новага кіраўніка і памоцніка кіраўніка, у якасьці прадставіцельнае ўмовы для падпісаньня памянёнае дэклярацыі і для адчыненьня канфэрэнцыі, паколькі такая працэдура супярэчыла-б агульнаму прынцыпу, выкладзенаму ў арт. 2 праэкту дэклярацыі, які ўжо быў прыняты савецкім урадам.

3. Што тычыцца прычын направак, запрапанаваных савецкім урадам, дык нацыянальны ўрад прытрымліваецца таго погляду, што яны могуць быць пакінуты дзеля разгляду на маючай адбыцца канфэрэнцыі; калі канфэрэнцыя вырашыць на карысьць запрапанаваных направак, дык нацыянальны ўрад ня будзе пярэчыць супроць іх прыняцьця.

4. Нацыянальны ўрад прапануе, каб канфэрэнцыя мела месца ў Бэрліне замест Масквы, як гэта было запрапанавана савецкім урадам, і таксама спадзяецца, што падпісаньне намечанай супольнай дэклярацыі прадстаўнікамі абедзьвюх краін будзе таксама мець месца ў Бэрліне".

АД ТАСС'а: Па вестках, якія мае ТАСС, адказ ураду СССР будзе паведамлен кітайскаму ўраду і апублікаваны ў друку ў бліжэйшыя дні.

ПРАВАЛ СУДОВАЙ КАМЭДЫІ.

ВЕНА, 12-9. На Тэмэшварскім працэсе скончыўся допыт сьведкаў. Сьведкі абвінавачваньня канчаткова заблыталіся і большасьць іх была прымушана пацьвердзіць, што абвінавачаныя падлягаліся паліцыяй зьдзекам. У сувязі з гэтым пракурор прапанаваў старшыні суду забараніць абвінавачаным рабіць сьведкам запытаньні аб зьдзеках. У прамове абвінавачаньня, якую сказаў пракурор, ён быў прымушан, з прычыны поўнага маральнага правалу абвінаваўчага акту, адмовіцца ад абвінавачваньня ў няўмысным забойстве і патрабаў асуджэньня абвінавачаных за супраціўленьне, быццам зробленае імі ўладай. Ад абвінавачаньня 5 падсудных пракурор адмовіўся.

Водлуг паведамленьняў з Бухарэсту, там адбылася камуністычная дэманстрацыя супроць урадавага тэрору і камэдыі суду ў Тэмашвары. Былі чуты выгукі: „Няхай жыве СССР", „Далоў падрыхтоўку да імпэрыялістычнай вайны". Паліцыя акружыла дэманстрантаў і затрымала 20 чалавек, якія будуць аддадны пад суд.

Прыбыўшы на тэмэшварскі працэс міністр унутраных спраў Ґінацэску заявіў журналістам, што супроць камуністычнага руху будуць прыняты самыя рашучыя захады.

АРЫШТ КАНТРБАНДЫСТАЎ.

ЛЕНІНГРАД, 12-IX. АДПУ за апошнія часы арыштаваны кітайскія грамадзяне, якія займаліся кантрабандай. Кітайцы-кантрабандысты прывозілі ў межы Саюзу рознага выгляду кантрабанду: штучныя пэрлы, морфій, какаін, трыкатаж і г. д. Каб вывезьці валюту кантрабандысты прыбегалі да ўсялякіх хістрасьцяў. Не гледзячы на гэта яны былі выкрыты органамі АДПУ.

Кітаец Сэн-Юн-Сэн, які зварочваўся в Нямеччыны ў Кітай па транзітнай візе, быў затрыманы Ленінградзкім АДПУ з партыяй штучных пэрлаў, якія былі схаваны ў чамадане з падвойным дном. Пэрлы на суму ня менш 10 тысяч руб. былі прызначаны дзеля рэалізацыі іх у Ленінградзе.

У пасылцы, якая была адпраўлена з Харбіну праз Уладывасток у Ленінград на імя Чжан-Лін-Фа, у падвойных у сьценках фанэрнай скрынкі выкрыта 6 тысяч чырвонцаў, якія былі прызначаны дзеля куплі чужаземнай валюты.

У кітайца Цы-Хо-Цын знойдзена 1.550 даляраў. У Чжан-Лін-Фа ў розных рэчах аказалася зашытымі 4 тыс. даляраў. У Ен-Мін-Со і Чэн-Юн-Сэн у схаваных вопратных шчотках знойдзена 500 даляраў. Пры выезьдзе ў Манчжурыю ў Лі-Мао-Цін, Сун-Чжун-Фу і Ван-Шао-Лін было знойдзена да 20 тысяч даляраў, якія былі зашыты ў падшыўцы ватніх штаноў і вопратных шчотках.

Гэты сьпіс, па даных ДПУ, далёка ня вычэрпывае ўсіх злачынстваў, якія зроблены кітайскімі кантрабандыстамі. Агульная сума канфіскаванай валюты і тавараў перавышае 100 тыс. рублёў.

Кітай нічога не даб'ецца.

ЖЭНЕВА, 13. Камісія, якая назначае парадак дню, аднагалосна пастанавіла перадаць кітайскую прапанову (аб арганізацыі спэцыяльнага камітэту дзеля „вывучэньня мэтаду лепшага прымяненьня стацьці 19-й устава Лігі Нацый", якая прадугледжвае магчымасьць перагляду нераўнапраўных дагавораў, на абгавор у камісію па прававым пытаньням).

Кітайская прапанова будзе пахавана без асаблівых цяжкасьцяў у камісіі па прававых пытаньнях. У кожным выпадку кітайцы ніяк ня здолеюць выкарыстаць у даны момант дзеля таго, каб дабіцца перагляду нераўнапраўных дагавораў з заходнімі краінамі.

НІ КРОКУ НА САВЕЦКУЮ ЗЯМЛЮ.

Далёка-Усходняя Чырвоная армія—надзейны вартаўнік межаў нашае краіны.

Перапуд ваеннай клікі.

ТОКІЁ, 11. Як паведамляюць з Харбіну, рашучы адпор, які быў дадзен нашымі вайсковымі часьцямі ў райёне станцыі Пагранічнай кітайскім і белагвардзейскім атрадам, врабіў у кітайскіх ваенных кіруючых кругах вельмі вялікае ўражаньне і поўны перапуд, выклікаў паніку ў праўленьні УК чыгункі.

Зараз-жа паступілі загады аб агульнай эвакуацыі ст. Пагранічная і аб фактычнай забароне пабудовы дарогі на вучастку Пагранічная-Мулін. Харбінскі друк праходзе моўчкі адносна таго, што гэтыя апэрацыі былі толькі абаронай, а тлумача, як напад з мэтай націску на Кітай.

Нанкінскі ўрад жаліцца.

ШАНХАЙ, 12. Як паведамляюць некаторыя газэты, нанкінскі ўрад даручыў У-Чжао-Чу паведаміць Лігу Нацый аб тым, што „савецкае войска ўступіла на станцыю Пагранічная і станцыю Манжурыя".

Новая хваля арыштаў.

ШАНХАЙ, 12. З Харбіну паведамляюць, што там узноў учынены новыя арышты савецкіх грамадзян. Як перадае агенцтва Рэйтар, за апошнія дні арыштавана некалькі сот чалавек.

Нанкін просіць.

ШАНХАЙ, 13-9. Апублікована новая нота нанкінскага ўраду Злучаным Штатам і Францыі, у якой Нанкін аноў просіць гэтыя дзяржавы адмовіцца ад прывілегій экстэрытарыяльнасьці і безвалочна ўступіць у адпаведныя перамовы з прадстаўнікамі Кітаю. Нота складзена ў тоне просьбы.

Гараць склады.

ШАНХАЙ, 13-9. У Нанкіне згарэлі вялізарныя склады Цяньцзін-Пукаўскай чыгункі. Прычыны пажару ня выяўлены.

Нядаўна ў Нанкіне паляцелі ў гару склады амуніцыі, пры абставінах, якія таксама ня выяўлены.

Чакаецца прыезд.

ПЭЙПІН, 13-9. Чакаецца прыезд Чжу-Шао-Яна, былога даверанага ў справах Кітаю ў Маскве.

Уздым клясавага змаганьня.

Дэманстрацыя саюзу чырвоных франтавікоў.

БЭРЛІН, 11-9. У Лейпцыгу адбылася дэманстрацыя ўсей лейпцыгскай арганізацыі саюзу Чырвоных Франтавікоў. У адну і тую-ж гадзіну ва ўсіх кварталах гораду выступілі атрады дэманстрантаў у поўнай форме. Дэманстрацыя працягвалася поўгадзіны, прычым рабочае насельніцтва Лейпцыгу бурна вітала дэманстрантаў.

Бастуюць рабочыя скураных фабрык.

ВЕНА, 12-9. 10 верасьня бастуюць 2 тысячы скуранікаў усіх венскіх і часткаю ніжня-аўстрыйскіх заводаў, патрабуючы абяцанай прадпрыёмцамі 20 проц. прыбаўкі. Прадпрыёмцы настойваюць, каб бастуючыя зьвярнуліся да працы 13 верасьня, пагражаючы ў праціўным выпадку лёкаутам.

Закон супроць камуністаў.

БЭРЛІН, 12-IX. Скончана распрацоўка новага законапраэкту аб ахове рэспублікі. На ўрадавых колах разьлічваюць, што з прычыны апошніх замахаў бамбістаў, удасца хутка законапраэкт працягнуць праз рэйхстаг. Аднак, хаця неабходнасьць новага асобага закону аб ахове рэспублікі тлумачыцца усё больш і больш частымі замахамі фашысцкіх тэрарыстаў, у сапраўднасьці закон будзе, на агульнай думцы, дапасоўвацца супроць камуністаў.

Вельмі характэрна, што ўжо зараз буржуазны друк, абгаварваючы ўрадавы законапраэкт, ставіць яго ў сувязь ня столькі з фашысцкімі замахамі, сколькі з кампаніяй кампартыі супроць пагаршэньня страхаваньня па беспрацоўю. Трэба адзначыць таксама, што ў цяперашнім законапраэкце адсутнічае пункт з ранейшага закону аб ахове рэспублікі, які забараняе былому кайзэру Вільгельму вярнуцца ў Нямеччыну.

Выканком прымушан заявіць.

ЛЁНДАН, 13-9. Выканком агульна-ангельскай фэдэрацыі горнарабочых параншыў зноў падцьвярдзіць «сваю адданасьць» прынцыпу агульна-ангельскай згоды па зарплаце. (Як вядома, у сучасны момант гэты прынцып не захоўваецца і згода паміж прадпрыемцамі і чорнарабочымі аб зарплаце заключаецца ў кожным райёне паасобна)

Выканком мае намер прапанаваць прадпрыемцам пераглядзець іх пазіцыю. Па агульнай думцы, прадпрыемцы адкажуць адмовай. Буржуазны друк выказвае баязнь, што ў выпадку скарачэньня рабочага дню ў вугольнай прамысловасьці вырастуць цэны на вугаль.

Зьдзекі і забойствы палітвязьняў.

БЭРЛІН, 12-9. Водлуг паведамленьня з Коўні, за апошнія часы вельмі абвастрыўся рэжым для палітычных зьняволеных у літоўскіх турмах—асабліва ў ковенскай турме. Над палітычнымі зьняволенымі зьдзекуюцца, пасьля чаго некаторыя цяжка хварэюць (запаленьне мозгу, вар'яцтва і нават сьмерць).

Па атрыманых вестках, на днёх у ковенскай турме ад запаленьня мозгу, з прычыны пабояў, памёрла Красьцінайвэ, якая прысуджана нядаўна на вечную катаргу па справе арганізацыі «Спартак».

Сьледзтва вядзецца сакрэтна.

НЬЮ-ЁРК, 13-9. Як паведамляюць з Шарлоты (штат Паўночная Караліна) расьледваньне справы аб наскоку на памяшканьне левых прафсаюзаў вядзецца ў сакрэтным парадку, відаць, з баязьні, што зробяцца вядомымі імёны кіраўнікоў наскоку.

Дзеячы левых прафсаюзаў пацьвярджаюць, што натоўпам, які граміў памяшканьне ў прафсаюзах кіраваў Карпэнтэр, які выступаў абвінавайцам на працэсе гастонскіх тэкстыльшчыкаў.

У дзень 1 верасьня.

ВЕНА, 10-IX. Водлуг паведамленьняў буржуазнага баўгарскага друку, у дзень 1 верасьня (Міжнароднага Дню Моладзі) групы рабочай маладзі спрабавалі наладзіць у розных кварталах сталіцы дэманстрацыю, але ўсюды былі разагнаны паліцыяй.

Водлуг паведамленьняў газэты «Свободная речь», 16 рабочых арыштавана. Па даным апазыцыйнага друку, лічба арыштаваных значна большая.

НА СЬВЯТКАВАНЬНЕ 12 ГАДАВІНЫ.

БЭРЛІН, 11-9. Агульна-нямецкі ка мітэт саюзу прыяцеляў СССР публікуе адозву, у якой заклікае ўсіх працоўных паслаць у СССР самых актыўных і лепшых клясавых барацьбітоў дзеля ўдзелу ў сьвяткаваньні 12 гадавіны Кастрычнікавай Рэвалюцыі.

Як зазначаецца ў адозьве, лік дэлегатаў павінен складацца з 100 чалавек.

ПАЗБАЎЛЯЮЦЬ ДАПАМОГІ.

БЭРЛІН, 12-IX. Водлуг паведамленьняў гатэт, яшчэ ў верасьні магчыма будзе склікана сэсія рэйхстагу дзеля прыняцьця законапраэкту аб страхаваньні ад беспрацоўя, які значна скарачае дапамогу беспрацоўным. Водлуг слоў „Бэрлінэр Лёкаль-Анцэйгер" у парлямантскіх колах лічаць, што партыі ўрадавай кааліцыі прыймуць пры абгаварэньні законапраэкту папраўку, якую прапануе партыя цэнтру.

Згодна гэтай папраўкі, беспрацоўны атрымлівае права на дапамогу толькі пасьля году беспрацоўя. Гэтае новае пагоршаньне дапамогі па беспрацоўю надзвычайна цяжка адаб'ецца на сотнях тысяч беспрацоўных.

Супроць апартуністычнай апазіцыі.

ПАРЫЖ, 10-9. Рух радавой масы членаў унітарнай канфэдэрацыі працы супроць апартуністычнай апазіцыі набывае ўсё больш магутны характар. У вялізарнай колькасьці пастуцаюць рэзалюцыі прынятыя на мясцох, у якіх рабочыя ганьбяць апазіцыю і залічваюць аб сваёй адданасьці Прафінтэрну і ўнітарнай канфэдэрацыі.

Так, надзвычайны зьезд парыскіх мэталёўцаў выказаўся за генэральную лінію ўнітарнай канфэдэрацыі і за безагаворачнае супрацоўніцтва з кампартыяй. Землякопы Парыскага райёну прынялі такую-ж рэзалюцыю. Докэры Бардо, ня гледзячы на тое, што абодвы сэкратары фэдэрацыі зьяўляюцца апазіцыянэрамі, выказаліся за генэральную лінію ўнітарнай канфэдэрацыі.

Супроць крывавых падзей у Палестыне.

Працоўныя яўрэйскія масы спачуваюць вызваленчаму руху арабаў.

На мітынг-пратэст, які адбыўся 12-га верасьня ў клюбе Карла Маркса, зьявіліся ня толькі шырокія працоўныя яўрэйскія масы, але шмат было рабочых і работніц неяўрэяў, бо ўсіх аднолькава цікавяць крывавыя падзеі, якія нядаўна выбухнулі ў Палестыне.

Выступаюць з прамовамі: прадстаўнік амэрыканскай яўрэйскай камуністычнай партыі і супрацоўнік амэрыканскай яўрэйскай камуністычнай газэты „Фрайгайт" т. Новік, старшыня культаддзелу ЦСПСБ т. Табайнік, т. Розенгауз і інш., якія далі вычэрпваючы малюнак сучаснага гаспадарчага і палітычнага стану Палестыны.

Што прадстаўляе сабою сучасная Палестына? Гэта невялічкая краіна, ня большая нашага Біра-Біджану, з той толькі розьніцаю, што замест ураджайнай глебы Біра-Біджану у Палестыне пераважна займаюць камяністабязводныя пустэчы, няўдобныя для земляробства. Але затое гэта краіна зьяўляецца ключом для панаваньня над Суэцкім каналам, гэты кавалак пустэчы патрэбны ангельскаму імпэрыялізму, каб трымаць у сваіх кіпцёх падначаленыя арабскія народы.

Ангельскі імпэрыялізм выкарыстоўвае для сваіх мэт сіяністаў—яўрэйскую буржуазею, якая захопліваецца аванцюрнай ідэяй,—ідэяй „адраджэньня яўрэйскай дзяржавы" ў краіне засялёнай арабамі.

Тав. Новік, які нядаўна прыехаў з па-замежаў і які прысутнічаў на Цюрыхскім сіяніцкім кангрэсе,—прыводзіць цэлы шэраг фактаў аб правале сіяніцкай авантуры. Нават буржуазны нямецкі друк, карыстаючыся выгаднымі крыніцамі, пісаў аб тым, што ангельскі імпэрыялізм сумысьля распаліў агонь варожасьці паміж арабамі і яўрэямі. Ангельская рэакцыя выкарыстоўвае стары, выпрабаваны царскі мэтад, мэтад разьні адной нацыянальнасьці другой, мэтад пагромаў. Пацкоўваючы арабаў на яўрэяў і яўрэяў на арабаў—гэтым самым ангельскі імпэрыялізм замацоўвае свае пазіцыі на гэтым вулкане, дзе моцна палыхае агонь вызваленьня руху арабскага народу. Каб затармазіць нацыянальнае вызваленьне выкарыстоўваюцца ўсе сродкі. Льюцца рэкі крыві, сотні людзей прыносяць у афіру сваё жыцьцё, распальваецца шалёная злосьць паміж працоўнымі абодвых народаў.

У гэтай ганебнай ролі жандары ў Палестыне сіяністы адыгрываюць не апошняе месца.

Нацыянальны ўціск у буржуазных краінах і бязгрунтоўныя лятуценьні сіяністаў закінулі ў Палестыну многія дзесяткі тысяч працоўных яўрэйскіх мас, якія служаць сродкам для распальваньня нацыянальнай варожасьці і гатым узмацняюць магутнасьць брытанскага імпэрыялізму.

Толькі ў Савецкім Саюзе правільна вырашана нацыянальнае пытаньне. Тут працоўныя ўсіх нацый жывуць паміж сабою ў згодзе, тут няма папуючай і прыгнечанай нацыі.

Сход прыняў рэзалюцыю пратэсту супроць крывавых падзей ангельскіх імпэрыялістаў у Палестыне.

„Магільны спакой" у Палестыне.

АНГЕЛЬСКІЯ І МПЭРЫЯЛІСТЫ НА ТРУПАХ АРАБСКІХ І ЯЎРЭЙСКІХ ПРАЦОЎНЫХ ІМКНУЦЦА ЎМАЦАВАЦЬ СВАЁ ПАНАВАНЬНЕ.

Англія не адмовіцца ад мандату на Палестыну.

ЛЁНДАН, 12-9. Рэйтэр паведамляе: „міністр калёній Пасфільд (Сіднэй Вэб) прыняў дэпутацыю прадстаўнікоў адміністрацыйнай рады яўрэйскага агенства (эміграцыйнага камітэту) і генэральнай рады сіяніцкай арганізацыі. Адказваючы дэпутацыі, Пасфільд заверыў яе, што Англія не адмовіцца ад мандату на Палестыну і ня зьменіць палітыку, якая дапамагае наладжваньню прытулку дзеля яўрэйскага народу ў Палестыне. Пасфільд дадаў, што паліцэйскія сілы ў Палестыне ўзмоцнены назначэньнем паліцэйскіх, завербаваных у Англіі.

Новыя вайсковыя часьці, уведзеныя ў Палестыну, у сувязі з непарадкамі, будуць эвакуіраваны толькі ў тым выпадку, калі будзе прызнана, што іх можна адклікаць бяз страты дзеля грамадзкага парадку".

Трупы забітых арабаў у вадаёмах.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 5-9. Па атрыманых тут зьвесткам каля г. Хіцім (14 кілёмэтраў на захад Ціварыядзкага возера) каля аднэй тысячы арабаў спрабавалі ўзяць наскокам паліцэйскую казарму. Ангельскае войска, якое тут надасьпела, адбіла напад арабаў. У выніку 12 забітых арабаў.

Другая ўзброеная сутычка з ахвярамі з боку арабаў мела месца ў Тальпіяце, каля Іерусаліму. З іншых месц Палестыны паведамляюць, што там паступіў поўны пакой. Які характэр гэтага «спакою» паказвае той факт, што ўсюды ў арабскіх селішчах робяцца вобыскі, за якімі і арышты. Нярэдка вобыскі служаць „прычынай" да адняцьця ад арабаў іх уласнай маемасьці.

У Іерусаліме дастаўлена звыш 300 закутых у кандалы фелахаў, якія абвінавачваюцца ў нападах на ангельскае войска ў раёне Іерусаліму. У Сафедзе ў адным з вадаёмаў выяўлена шмат трупаў, відаць, ахвяр нядаўных боек.

Сёньня паведамляюць аб новых буйных сутычках у раёне да поўначы ад гары Табар і да поўдню ад Газы. Атрыманы весткі аб руху вялікіх войск арабаў з Нэджду якія накіраваліся да Палестыны.

Поўны „парадак" у Палестыне.

ЛЁНДАН, 12-9. Рэйтэр паведамляе з Іерузаліму: „згодна апошняму ўрадаваму комунікэ, становішча ў Палестыне настолькі забясьпечана, што раскіданае раней войска сьцягваецца і можа быць перакінута ў асобныя гарады Яфу і Хайфы. Высаджаныя там атрады марской пяхоты зварачваюцца на судны, але судны будуць пакінуты, пакуль становішча ня зробіцца трывалым настолькі, каб уход іх зрабіўся магчымым. Унутры краіны застаецца дастатковая колькасьць войска».

Р. Шульлер.

Рэвалюцыйная адвага аўстрыйскага пралетарыяту.

З бойкі пры Сант-Лёрэнцы пачынаецца пэрыяд рашучай барацьбы паміж фашызмам і рабочай клясай у Аўстрыі. Напад фашысцкіх хэймвэраў на рабочых у Сант-Лёрэнц хоць было зусім відавочна, што тамашні зьезд сацыял-дэмакратыі меў сваёй мэтай папярэдзіць выбух абурэньня рабочых папярэднімі гвалтамі фашыстаў. Сацыял-дэмакраты лічылі сябе зусім здаволенымі, калі заля пасяджэньняў у Сант-Лёрэнцы была захоплена хэймвэрамі. Але рабочыя прымусілі Воліша і яго прыхільнікаў склікаць сход на царкоўным пляцу. Гэтыя-ж рабочыя адважна спаткалі першы агонь хэймвэраў, напаўшых на сход.

Сярод іх знаходзіліся камуністы: яны распаўвалі рашучасьць рабочых сіле ворага паставіць сілу. І рабочыя абаранялися добра. Па загаду сацыял-дэмакратычных лідэраў яны яшчэ загадзя здалі паліцыі тую зброю, якая пры іх была. І зараз ім прышлося абаранящца пры дапамозе каменьняў, кіёў з парканаў, скураных паскаў, голых кулакоў. У вельмі нямногіх былі рэвальвэры. Яны абаранялися так пасьпяхова, што ня гледзячы на колькасную перавагу фашыстаў, апошнім не ўдалося з імі справіцца; найбольшы лік параненых быў з боку фашыстаў. Чацьвёра забітых з боку рабочых. Але ў фашыстаў сярод забітых—адзін з Хэймвэраўскіх правадыроў, пачаўшых праліцьцё крыві. Ён пакараны на заслугах.

Такім чынам, фашыстам прышлося пераканацца, што яны ся сваімі праэктамі ажыцьцяўленьня дыктатуры сустракаюць самы рашучы адпор рабочых.

Рэха падзеі ў Сант-Лёрэнцы моцна адгукнулася сярод рабочых мас Аўстрыі. Яшчэ ў той-жа вечар здарыліся сурёзныя сутычкі ў Бруку, Грацы, Андрыцы, Кніттэльфэльдзе, дзе абураныя рабочыя выступілі супроць фашыстаў. Чатыры тысячы ўзброеных хэймвэрцаў вартавалі горад Юдэнбург—галоўную кватэру Пфрымэра. Раніцою наступнага дню выбухнула масавая палітычная забастоўка ў Вене. Амаль ва ўсіх гілінах мэталёвае вытворчасьці Вены, асабліва на буйных фабрыках, рабочыя, па ўласнай ініцыятыве спынялі працу і зьбіраліся на мітынг. На фабрыцы Фіат і на некаторых іншых былі прыняты рэзалюцыі, заклікаючыя да генэральнай забастоўкі. Рабочыя паслалі дэлегатаў да сацыял-дэмакратычных партыйных кіраўнікоў, з патрабаваньнем прыняць меры па лініі падрыхтоўкі барацьбы супроць фашыстаў. Асабліва відаць было раздражненьне рабочых у іх адносінах да таго нязначнага ліку фашыстаў, якія былі заняты разам з імі на вытворчасьці: яны заявілі, што не адновяць ні ў якім выпадку працу, пакуль фашысты будуць знаходзіцца ў іх шэрагах.

Сацыял-дэмакратычнай партыі і прафсаюзным лідэрам прышлося патрацiць вельмі многа сіл раней, чымся ўдалося схіліць рабочых да адзінаўленьня працы. Гэта ім удалося пасьля дачы фальшывага абяцаньня склікаць канфэрэнцыю для абмеркаваньня спосабаў рабочай самаабароны.

Сацыял-дэмакраты склікалі канфэрэнцыю. Прызначэньнем апошняй было прыдушэньне баявой актыўнасьці рабочых мас. Рэзалюцыя, ухваленая сацыял-дэмакратычнымі здраднікамі дзівіць сваёю бессаромнасьцю: яна прадпісвае рабочым не прадпрымаць нічога бяз спэцыяльнай згоды на тое лідэраў. Аным словам, старая песьня: фашысты будуць усюды падрыхтоўваць, ня лічачыся са сродкамі фашысцкую дыктатуру, а рабочыя будуць чакаць якогасьці сыгналу ад сацыял-дэмакратыі, да той пары пакуль... ня будзе зацьверджана фашысцкая дыктатура. Тады фашызму і сацыял-дэмакратыі ня будзе асабліва цяжка канчаткова расправіцца з рабочай клясай.

Але падзеі паказваюць, што аўстрыйскія рабочыя масы ня схільны папасьці ў гэту пастку. Яшчэ не папярпеўшыя ніводнага рашучага паражэньня, знаходзячыся ў вельмі цяжкіх гаспадарчых умовах дзякуючы гнілой і хісткай капіталістычнай сыстэме, аўстрыйскія рабочыя ўсё больш і больш лявеюць; расьце іх клясавая і палітычная сьвядомасьць. Падходы сацыял-дэмакратаў могуць стварыць цяжкасьці на шляхох барацьбы супроць фашызму, але зусім спыніць гэту барацьбу ні ніяк ня ўдасца. Апошнія падзеі ў Сант Лёрэнцы толькі загартавалі волю рабочых да барацьбы і даказалі таксама, наколькі правільна ацэнка кан'юнктуры, у цяперашняй Аўстрыі, зробленая камуністычнай партыяй. Рабочыя бачаць цяпер, што справа ідзе ня сёньня, дык заўтра да абвяшчэньня фашысцкай дыктатуры; рабочыя бачаць таксама, што ім трэба бараніць сваю ўласную скуру,—бараніць яе яны рашылі цьвёрда.

На палявеньне і гатоўнасьць да бою рабочых буржуазея адказвае фашысцкім тэрорам. Мы толькі што бачылі на навочным прыкладзе, наколькі абвострана клясавая варожасьць. Трэба памятаць яшчэ аб узрастаючай няўстойлівасьці так званае капіталістычнае стабілізацыі. Усё гэта абяцае буйныя палітычныя і эканамічныя ўскладненьні ў недалёкай будучыні.

Ня гледзячы на нязьменнае падтрыманьне сацыял-дэмакратыі, аўстрыйская буржуазеі ня ўдасца справіцца з рабочымі. Аўстрыйская сацыял-дэмакратыя з 15 ліпеня 1927 году эвалюцыянірвала з шалёнаю хуткасьцю. У чырвоныя ліпеўскія дні яны рашуча распісваюцца ў банкруцтве „аўстра-марксызму". Яе ранейшае жанглёраньне грознымі сказамі аб захопе ўлады і рэвалюцыйным перавароце зьмяняецца на мірныя і чулыя заклікі буржуазных партый да супольнае працы. Тыя часы, калі аўстрыйскую сацыял-дэмакратыю можна было лічыць партыяй „левай", прадстаўніцаю аўстра-марксызму, мінулі беззваротна. Яна адкрыта заняла рэфармісцкую пазіцыю, і толькі часамі, каб канчаткова не скампрамэтаваць сябе ў вачох няўхільна лявеючых мас, рабіць той або іншы, у дастатковай меры няпэўны „левы" гэст. І ўсё мацней выяўляюцца ў ёй сацыял-фашысцкія тэндэнцыі.

Віна за тое, што фашызм амаль безперашкодна падрыхтоўвае сваю дыктатуру ў значнай ступені ляжыць на сацыял-дэмакратыі. Гэта яна здрадзіла шматабяцаўшае і бліскучае рэвалюцыйнае пачынаньне 15-га ліпеня 1927 году. З таго часу яна запляміла сябе шэрагам самых агідных капітуляцый і здрад. Здаецца далей ісьці няма куды паколькі яна стварае цяпер з фашызмам адзіны блёк.

У аўстрыйскіх рабочых ёсьць толькі адзін надзейны і верны правадыр—аўстрыйская камуністычная партыя. Апартуністычныя элемэнты, меўшыя ў ёй месца ў момант выступленьня 15-га ліпеня—вінаваты ў тым, што яна дапусьціла некаторыя памылкі, якія ўсё-ж не перашкодзілі разьвіць тады энэргічную рэвалюцыйную дзейнасьць. Зараз партыйная лінія выпраўлена і камуністычная партыя кіруе працэсам радыкалізацыі рабочых мас і іх барацьбой супроць фашызму. Правільнасьць узятай лініі відаць хоць-бы з таго, што пасьля Сант-Лёрэнцкіх падзей яна адзіным правільным рэагаваньнем на гэтыя падзеі прызнала арганізацыю генэральнай забастоўкі і пагазоўнае ўзбраеньне пралетарыяту. Камуністычная партыя паказала рабочым, што ёсьць толькі адзін сродак вызваліцца ад фашысцкага тэрору: супрацьпаставіць яму баявую рэвалюцыйную сілу, ёсьць толькі адзін сродак перашкодзіць ажыцьцяўленьню фашысцкай дыктатуры: ажыцьцявіць дыктатуру пралетарыяту.

У атаку супроць правага ўхілу і нацыянал-дэмакратызму.

Накіраваць агонь бальшавіцкай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, па канкрэтных насіцелях правага ўхілу, на выкрыцьцё прымірэнцаў да барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам.

МЕНСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПАВІННА ЎЗМАЦНІЦЬ СВАЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ КЛЯСАВУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ.

На сходзе менскага гарадзкога партыйнага актыву.

Апошні сход партыйнага актыву гор. Менску, які адбыўся 11-га верасьня, заслухаў даклад сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Гамарніка аб выніках апошняга верасеньскага пленуму ЦК КП(б)Б. Вельмі важныя пытаньні, якія вырашаў пленум, задачы, намечаныя пленумам па гэтых пытаньнях, аб якіх дакладваў тав. Гамарнік, выклікалі вялікую ўвагу і зацікаўленасьць з боку партыйнага актыву.

Канкрэтныя факты праяўленьня правага ўхілу ў зямельнай палітыцы, нацыянальна-культурным будаўніцтве, аб якіх пленум ЦК у сваіх пастановах сказаў сваё слова на партактыве сустрэлі жорсткае асуджэньне. Партактыў патрабаваў ад ЦК і ўсіх партарганізацый яшчэ больш жорсткай барацьбы з праявамі правага ўхілу, з фактамі скажэньня клясавай лініі ў гаспадарчай, нацыянальна-культурнай і ўсёй іншай рабоце.

Па дакладу тав. Гамарніка першым выступіў т. Фрыдман. Прамоўца, гаворачы аб барбоўцы ў партыю перадавых рабочых, паказаў на тое ненармальнае становішча, што парт'ячэйкі не змаглі разгарнуць свае работы па прыцягненьні на адкрытыя партсходы рабочых мас.

Тав. Мар'ясін, гаворачы аб саматужна-прамысловай каапэрацыі, паказвае на тое, што арцелі, якія ахапляюцца сампрамкаапэрацыйным аб'яднаньнем, былі засьмечаны да 1927 году, г. зн. да таго часу, калі там былі ранейшыя кіраўнікі.—У рабоце саматужна-прамысловай каапэрацыі,—кажа прамоўца,—ня было сьвядомага (?) ажыцьцяўленьня права-апартуністычных тэорый у практычнай рабоце, было дапушчана на пэўным адрэзку часу рад палітычных памылак (?!). Гэтыя памылкі мы зараз з усёй сілай і плённа выпраўляць пры дапамозе ўсяе партарганізацыі.

Тав. Галавач. Я спыняюся на двух пытаньнях: правым ухіле і культурна-нацыянальным будаўніцтве. На сёнешні дзень тэорыі правых знайшлі сваіх пасьлядоўцаў і ў нас у КП(б)Б, і мы ўжо маем рад фактаў узорнай правай практыкі. Такая практыка была ў Наркамземе—сыстэма хутароў, розныя мінімальныя зямельныя нормы для беднякоў і кулакоў, празьмерная даверлівасьць буржуазным спэцыялістым.

Была яна і ў Белсампрамкаапэрацыі, дзе часта рабілі стаўку на прыватную ініцыятыву і сродкі", а ў выніку—засьмечанасьць каапэрацыі нэпманскімі і кулацкімі элемэнтамі.

Маем мы ажыўленьне актыўнасьці правых і ў культурна-нацыянальным будаўніцтве.

Я пераліччу толькі некалькі фактаў: ліст трох беларускіх пісьменьнікаў, „тэатральная" дыскусія, ідэалізацыя мінулага беларускага нацыянальнага руху ў некаторых „гістарычных" артыкулах, высоўваньне некаторых асоб у акадэмікі. У прыватнасьці аб акадэміках я хачу сказаць, што нашы органы, якія высоўвалі акадэмікаў, у некаторых выпадках, відаць, спасавалі перад нацыянальным беларускім аўтарытэтам асобных „вучоных" і зрабілі іх акадэмікамі.

На фронце культурна-нацыянальнага будаўніцтва мы маем узмацненьне актыўнасьці нацыянал-дэмакратызму і маем факты змыканьня на гэтым вучастку правых з нашае партыі з буржуазнымі інтэлігентамі. І вось, ня гледзячы на такую ня бедную сэрыю фактаў з правае практыкі, ды яшчэ і ў партыі і асабліва, я кажу, у камсамоле, не мабілізавалі, як трэба, мас партыйцаў і камсамольцаў для барацьбы з гэтай практыкай, для барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам. Я проста заяўляю, што ў пытаньнях барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам мы (камсамол) шмат чаго прамазалі. Адзнак з прычын гэтага зьяўляецца невыстарчальная разгорнутасьць самакрытыкі, аб гэтым сьведчаць ячэйкі Наркамзему, Наркамасьветы, акадэміі, там ёсьць партыйцы і камсамольцы. Атрымліваецца так, што ячэйка Наркамзему пасьля ўжо на сходзе размахвае кулакамі, а як тварылася правая практыка, многія таварышы з ячэйкі пэўна не набраліся сьмеласьці сказаць аб гэтым партыі.

Зараз аб культурна-нацыянальным будаўніцтве. Мы маем ажыўленьне актыўнасьці нацыянал-дэмакратычнай буржуазнай інтэлігенцыі. Прычыны гэтаму—нашае рашучае наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі і, як вынік гэтага, абвастрэньне клясавае барацьбы; актывізацыя беларускага кулака; уплыў нацыянал-дэмакратычных ідэй з-за кардону. У далейшым, з узмацненьнем культурна-нацыянальнага будаўніцтва з большым яшчэ набліжэньнем пралетарыяту да аўладаньня ўсімі культурнымі вышынямі, з далейшым наступленьнем на капіталістычныя элемэнты, мы будзем яшчэ мець ажыўленьне нацыянал-дэмакратыт, на працягу пэўнага пэрыяду. У зьвязку з гэтым нашымі задачамі павінна быць: мабілізацыя мас для самай рашучай барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам; поўнае аўладаньне працэсам культурнага нацыянальнага будаўніцтва, а ў зьвязку з гэтым галоўнейшая задача падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў. Тут камсамол можа і павінен зрабіць вельмі многае, а зроблена ў справе кадраў зусім мала.

У справе аўладаньня партыяй, пралетарыятам працэсамі будаўніцтва нацыянальнай культуры, асноўным ворагам зьяўляецца русацэнства сярод значнай часткі членаў партыі і камсамольцаў, якія ня выконваюць дырэктыў партыі па нац. пытаньнях. Ёсьць такія ў партыі і ў камсамоле псэўда-інтэрнацыяналістыя, якія адмаўляюць нац. палітыку партыі на тэй аснове, што яны інтэрнацыяналістыя, а па сваёй сутнасьці зьяўляюцца вялікадзяржаўнымі расійскімі шавіністымі, адгэтуль задача рашучай барацьбы і з вялікарускім шавінізмам.

Тое, што да гэтага часу партыя і пралетарыят ня сталі яшчэ цалкам на ўсіх вучастках на чале будаўніцтва нацыянальнай культуры, беларусізацыі, давала права асобным буржуазным інтэлігентам, нацыянал-дэмакратам прысвойваць сабе манаполію на „шчырых", „актыўных" і „адзіных" вырашаценяў беларускага пытаньня. Нам трэба лёзунг пленуму ЦК КП(б)Б „Уся КП(б)Б на чале культурнага будаўніцтва" ажыцьцявіць з усёй рашучасьцю, трэба трымаць у сваіх руках ініцыятыву па ўсёй працы па культурным будаўніцтве, а ў нас былі асобныя прарывы на гэтым фронце.

Для ажыцьцяўленьня лёзунгу пленуму ЦК партыі неабходна вытлумачыць самым шырокім масам рабочых, партыйцаў і камсамольцаў клясувую сутнасьць нацыянальнага пытаньня (многія гэтага не разумеюць) сутнасьць якая заключаецца ў тым, што наша нац. палітыка, такія яе элемэнты, як беларусізацыя, будаўніцтва беларускай культуры, абслугоўваньне нац. меншасьцяй, забясьпечваюць кіраўніцтва рабочае клясы ў нашай краіне, пагцыбляюць давер'е да пралетарыяту і партыі з боку працоўнага сялянства і працоўных нацменшасьцяй, узмацняюць дыктатуру пралетарыяту. Тады мы хутчэй пераможам правых, якія хаваюцца часамі ў маску нацыянал-дэмакрата, тады менш будзем мець прарываў.

Тав Эпштэйн паказвае на моманты, калі на выкрытыя друкам нездаровыя зьявішчы ў рабоце асобных парторганы рэагуюць са спазьненьнем, а часамі нават з невыстарчальнай увагай адносяцца да гэтае вялікае справы.

— Некаторыя партыйцы, нават адказныя работнікі,—кажа т. Эпштэйн,—за самакрытыку за выкрываньне нездаровых зьявішч лаюць наш друк. Дырэктар Белдзяржстрою Васэрман адну з газэт за выкрываньне бязчынстваў абзывае на партактыве „бульварнай газэтай". Гэткія асобы, як Васэрман, бачаць у друку ні больш ні менш, як сваіх ворагаў, якія па іх думцы „цкуюць сумленных працаўнікоў". Трэба па іх ударыць з усёй жорсткасьцю, трэба дапамагаць нашаму друку ў яго вялікай рабоце.

Тав. Чалядзінскі лічыць, што т. Гамарнік у сваім дакладзе, націскаючы на праявы правага ўхілу на эканамічным фронце (Наркамзем, саматужна-прамысловая каапэрацыя), ня спыніўся як трэба на праявах правага ўхілу і на культурна-ідэалёгічным фронце.

Мы цярпелі гадамі прапаганду контрэвалюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі праз часопіс „Полымя", „Савецкую Беларусь", праз некаторыя падручніхі... У свой час ня лічылі патрэбным рашуча змагацца з гэтым. Памыляліся. Мы ў сучасныя дні, у разгар клясавае барацьбы бачым, як нацыянал-дэмакратызм злосна пашоў у атаку на нашу ленінскую нацыянальную палітыку, супроць дыктатуры пралетарыяту. Чарада выглашаных (праз друк і вусна) „тэорый", як: далей адарэвалюцыйнай Масквы, бліжэй да капіталістычнага Захаду, адмаўленьне ў існаваньні беларускай буржуазеі, стварэньне нацыянал-дэмакратычных гэрояў (Кастуся Каліноўскага), Вярыгу-Дарэўскага). фальсіфікацыя гісторыі КП(б)Б, ідэалізацыя „Нашай Нівы" і г. д. і інш.—усе гэтыя і падобнага роду зьявы не прадстаўляюць сабой нічога для нас нечаканага і „загадачнага". Трэба разумець клясавую барацьбу ў нашай краіне, трэба ведаць зрухі ў фашысцкі лягер Пілсудскага беларускай буржуазнай інтэлігенцыі ў Зах. Беларусі. Трэба, нарэшце, зразумець гэтую сувязь!

Нядаўна нацыянал-фашысты Луцкевіч выдрукаваў у Вільні сваю чарговую працу, якая зьяўляецца выкладаньнем праграмы беларускага нацыянал-дэмакратызму. Ён робіць стаўку на Вільню, як будучы цэнтр—сталіцу „дэмакратычнай" буржуазнай Беларусі. Луцкевіч разьвівае тэорыю „незакончанай беларускай нацыянальнай рэвалюцыі". Ён нічога непапракае з б. грамадаўцаў і нашаніўцаў, якія зараз знаходзяцца ў радох КП(б)Б. Ён лічыць, што „сапраўдная" Беларусь у часы „рэвалюцый 1917-18 г. зрабіла толькі крок „наперад" да нацыянальнага вызваленьня", да завяршэньня свайго „ідэалу"—гэта спынілася на этапе, які завецца „БССР"—і... далей, задача Луцкевіча і яго дапаможнікаў Беларусь памкнуць на апошні крок „уперад"—гэта да БНДР цэнтрам—з сталіцай у Вільні, пад крылом Пілсудскага. Для гэтай справы Луцкевіч ня „пужаецца" браць для сваёй кнігі эпітэты з творчасьці некаторых беларускіх паэтаў, якія зараз знаходзяцца на тэрыторыі БССР, і тых паэтаў, якія часта на сходах у Доме Пісьменьнікаў заўсёды лічаць сябе „пралетарскімі пісьменьнікамі". Аднак, горш усяго, што асобныя паэты дагэтуль яшчэ ня выказалі свайго голасу пратэсту супроць скарыстаньня іх імя Луцкевічам.

Ці займаліся мы як трэба вывучэньнем цэлага раду важнейшых у нашых умовах гэтых зьявішч, ці ведала, як належа партыя, аб гэтых працэсах, ці мабілізаваны масы на рашучую барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам? Трэба прызнацца, што не, спазьніліся, як адзначала перадавая „Зьвязды" і адозва верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б.

Адзіная толькі „Зьвязда" сыгналізавала аб небясьпецы. У часы тэатральнай дыскусіі „Зьвязда" перад усімі сярвала „самабытную" маску, за якой хаваўся доўгія гады нацыянал-дэмакратызм, рынулася на рашучую барацьбу з ім, але... трэба шкадаваць, што атрымала ў гэтай барацьбе „рубцы" ня так ад ворага, як ад свайго прыяцеля... „Савецкая Беларусь"—апынулася зброяй у руках нацыянал-дэмакратаў для барацьбы са „Зьвяздой".супроць лініі КП(б)Б.

Зараз вышаў з друку чарговы (ліпеньскі) нумар „Полымя" і рэдакцыя (ужо абноўленая) ні адным словам не абмовілася аб памылках часопісі, аб тым, што яна асуджае старую нацыянал-дэмакратычную лінію часопісі, і што гэту лінію бярэцца выправіць пабальшавіцку.

Наша Акадэмія Навук, створаная ў выніку Кастрычніцкавае рэвалюцыі, у выніку ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту, павінна быць лябараторыяй для вырабу на аснове марксыцка-ленінскага вучэньня нам навуковых сродкаў для пабудовы Сацыялістычнай Беларусі. Ці так яно ёсьць сёньня на справе? Ня зусім. Мы павінны ўлічыць „пляску" нацыянал-дэмакратаў Зах. Беларусі, ксяндза Станкевіча і к-о, якія сьцьвярджаюць, што акадэмія „іх"—нацыянал-дэмакратычная. Мы гэтымі днямі ў „Зьвязьдзе" чыталі заметку, што ў Акадэміі займаюць адказныя навуковыя пасты людзі са стажам белагвардзейшчыны, расейскага чорнасоценства, як Цьвяткоў, нацыянал-дэмакраты, палёнафілы і іншыя людзі з пагрэшнасьцямі на разрад ніжэй.

А паглядзеце, чым займаюцца акадэмікі „савецкае" маркі, скажам як С. Некрашэвіч, за „савецкасьць" якога некаторыя нашы адказныя таварышы гатовы рабіцца. Вось перад вамі таўшчэразная кніга—Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук Акадэміі. Якая роскаш, выдана на лепшай паперы, з клішэ і рознастайнымі шрыфтамі. У ёй выдрукавана праца С. Некрашэвіча. Праца акадэміка С. Некрашэвіча прадстаўляе сабою „салідны" досьлед нейкага „сьвятога пісаніня прэпадобнага айца Касьяна Вераміты" XVII стагодзьдзя.

Ня будзем сароміць сябе, гаворачы аб гэтай працы памінам аб марксызьме, што пры крытыцы гэтага „навуковага" досьледу Некрашэвіча трэба карыстацца цытатамі Маркса ці Леніна, даказваць, што для сучаснасьці ў палітычным сэнсе гэты „досьлед" „сьвятой пісаніны" „отца" Касьяна Вераміты—непатрэбная рэч, ён і ў навуковым сэнсе грошу—ня варты!

Кажуць, што гэта робіцца для ўзбагачэньня культуры беларускае мовы—дык вучэцеся, таварышы, беларусізуйцеся па „сьвятому пісьму прэпадобнага отца Касьяна Вераміты".

Сурёзна, таварышы, трэба ставіць пытаньне аб рабоце нашай Акадэміі. Там слабы партыйны камуністычны асяродак. Там амаль адсутнічаюць навуковыя марксысцкія кадры. Пара ў Акадэмію накіраваць жывую крыніцу вылучэнцаў, навуковых працаўнікоў-камуністых. Пара ЦК КП(б)Б паставіць пытаньне аб мабілізацыі якой-небудзь сотні, ці больш, камуністых на вучобу ў марксысцкія ВНУ Савецкага Саюзу. Трэба ўмацаваць культурна-ідэалёгічны фронт!

Тав. Шапіра. Задачай партактыву зьяўляецца гарантаваць сваёй актыўнай працай поўнае выкананьне пастановаў апошняга пленуму ЦК КП(б)Б, якія зьяўляюцца бязумоўна правільнымі і своячасовымі.

Ні ў дакладзе тав. Гамарніка, ні ў артыкуле ў „Зьвязьдзе" (ад 8-га верасьня) няма адказу на адно з важнейшых пытаньняў, якія мы павінны задаць як ЦК, так і „Зьвязьдзе": як гэта здарылася, што ў важнейшым пытаньні клясавай барацьбы ў Беларусі, у пытаньні аб барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам патрабавалася дапамога „Комсомольской Правды", якая мае іншыя асноўныя задачы? А што „Комсомольская Правда" аказала дапамогу ў гэтым пытаньні, сьцьвярджае і артыкул „Зьвязды" і тав. Гамарнік. Няўжо-ж без дапамогі „Комсомольской Правды" ніяк нельга было абыйсьціся? Я думаю, што тав. Гамарнік у заключным слове высьветліць гэтае пытаньне.

Зусім правільнае паказаньне т. Гамарніка аб тым, што „тэорыя" набліжэньня інтэлігенцыі да партыі і ўлады радам уступак зьяўляецца недарэчнай тэорыяй. А раз гэта так, дык неабходна, каб той адказны таварыш, які на XII зьезьдзе КП(б)Б яскрава сфармуляваў гэтую „тэорыю", рашуча і адкрыта адмовіўся ад гэтай сваёй думкі, што да гэтага часу ня зроблена.

Трэба дабіцца такога разгортваньня самакрытыкі, каб не тады загараўся „сырбор" у друку, калі ўжо зьнялі таго ці іншага наркома, а раней, каб наш друк загадзя сыгналізаваў-бы аб тых скажэньнях партыйнай лініі, якія наглядаюцца ў практычнай рабоце.

Трэба адзначыць, што практыка „штэмпэляваньня" і расхлябанасьці яшчэ мае шырокае распаўсюджаньне і зараз. Вось прыклад з курсамі вылучэнцаў, якія гэтымі днямі скончылі сваю работу. На гэтыя курсы было выклікана 120 чалавек рабочых ад варштату з усёй Беларусі, было патрачана на ўтрыманьне гэтых курсаў 10000 рублёў, а калі падводзяцца вынікі, высьвятляецца, што ніводзін з курсантаў не скарыстаны на практычнай рабоце, бо забыліся прадуглядзець па навучальнай праграме практычныя заняткі. А між тым праграма ўзгаднялася з усімі кіруючымі органамі. У ЦК КП(б)Б т. Гольдзін палажыў штэмпэль, у ЦСПСБ таксама нехта „ўзгадніў", а ў выніку, як быццам, і вінаватых няма. І тым ня менш калегія Наркамасьветы (ужо пры новым кіраўніцтве), абгаварваючы вынікі гэтых курсаў, па трафарацe піша рэзалюцыю, дзе пералічваецца „рад дасягненьняў". А калі рабочыя пасьля двохмесячных курсаў пашлі на прадпрыёмствы, то там над імі сьмяюцца—захацелі высока залесьці, а вас не прынялі. З такой практыкай, з такімі „дасягненьнямі" трэба рашуча пакончыць.

Тав. Ерухімовіч. Я лічу патрэбным і карысным для партыі назваць тыя скажэньні, якія мелі месца ў БССР, сваім поўным імем. Сапраўды, хто адказвае за хутарызацыю Беларусі? Хто адказвае за гэты „посьпех" Наркамзему, які змог за пяць год „абагнаць і перагнаць" Сталыпіна? Ці адзін былы нарком Прышчэпаў? Не. Адказвае і ЦК КП(б)Б. Факты гаварыць аб гэтым. І ад гэтых фактаў не схавацца.

Яшчэ ў 1926 годзе камісія ЦК КП(б)Б па гаспадарчым будаўніцтве, заслухаўшы даклад Наркамзему, пастанавіла „лічыць неабходным падтрымаць у БССР пасялковую форму „зямлякарыстаньня". У лютым 1928 г., ужо пасьля 15 партзьезду, пленум ЦК КП(б)Б адзначыў, што „практыка арганізацыі пасёлкаў паказала, што гэта форма зьяўляецца жыцьцёвай". Жыцьцёвай яна сапраўды зьяўляецца, але для каго? Для кулака, таварышы.

Тое самае адносна нацыянал-дэмакратызму. Чым тлумачыць, што ён так абнаглеў? Ці толькі „аб'ектыўнай" умовай, тым, што, бачыце, кулак вырас? Нельга ўсё ўзвальваць на „аб'ектыўныя" ўмовы. Нацыянал-дэмакратызм вырас, увмацніўся і абнаглеў і яшчэ таму, што з ім, па сутнасьці, вельмі мала змагаліся. Гэта таксама факт, які нельга абвергнуць.

Хіба-ж аб апартуністычнай палітыцы Наркамасьветы Баліцкага ЦК КП(б)Б нічога ня ведаў? Хіба-ж з нацыянал-дэмакратычнай інтэлігэнцыяй, з нацыянал-дэмакратамі тыпу Жылуновіча, якія залезьлі ў партыю, змагаліся? Не! З імі цацкаліся, з імі насіліся, супроць іх у БССР нельга было і выступаць! Цэнтральны орган КП(б)Б „Зьвязда" ня раз атрымлівала на руках за спробу даць адказ на атакі нацыянал-дэмакратаў супроць бальшавізму. „Зьвязда", гэта трэба проста сказаць, часта была адзінокай у гэтай барацьбе. ЦК КП(б)Б ахвотна падстаўляў сваю газэту пад удар, але не даваў у крыўду „багоў" з лягеру Жылуновіча, Баліцкага і іх партыйных, а галоўным, чынам, беспартыйных прыяцеляў.

У гэтым сэнсе вельмі характэрна тое месца ў перадавіцы „Зьвязды", дзе гаворыцца аб тым, што „мы спазьніліся". Так, ЦК КП(б)Б спазьніўся. Але ў клясавай барацьбе, як і на вайне, няма „пустых" месц, няма спазьненняў. Калі вы спазьніліся, то пасьпеў нехта другі. Пасьпеў клясавы вораг. Кулацтва ў БССР узмацнілася. Той, хто супярэчыць супроць гэтага сьвядома, або несьвядома, вольна або навольна скажае ісьціну.

Тыя матар'ялы, якія ёсьць у маім распараджэньні, сьведчаць аб тым, што ўзмацненьне нацыянал-дэмакратызму мае сувязь ня толькі з актывізацыяй кулацтва, але і з тым, што ў нашым пралетарскім лягеры зроблены буйнейшыя памылкі. Чым вытлумачыць тое, што камсамол, найважнейшая палітычная арганізацыя, стаяў у баку ад барацьбы з нацыянал-дэмакратызмзм? Чым вытлумачыць, што работа прафсаюзаў БССР была прызнана камісіяй УсеЦСПС нездавальняючай? Чым, урэшце, вытлумачыць тое, што „Савецкая Беларусь", "Полымя" бяскарна на працягу некалькіх гадоў цкавалі „Зьвязду", выступалі супроць Ленінскай лініі УсеКП(б)? Гэта ўсё факты аднаго і таго-ж парадку і сьведчаць яны аб тым, што мы маем у БССР некаторае паслабленьне клясавай пільнасьці.

Жылуновіч, Баліцкі і іх прыяцелі сюды ня прышлі, ня лічаць патрэбным выступаць. Трэба ім сёньня сказаць, што іх песенька сьпета. Партыя ня дасьць нікому бяскарна парушаць яе прынцыпы, яе лінію.

Супроць правага апартунізму, супроць нацыянал-дэмакратызму і прымірэнчых адносін да яго, за бальшавіцкую непрымірымасьць—вось пад гэтым лёзунгам мы згуртуемся за ажыцьцяўленьне пастановаў пленуму, які вызначыў шляхі да пералому ва ўсёй рабоце КП(б)Б.

Тав. Агурскі. Я буду гаварыць пра самакрытыку ў партыі. Тут тав. Шапіра ў сваім выступленьні задаў пытаньне як гэта магло здарыцца, што „Комсомольская Правда" павінна была дапамагаць „Зьвязьдзе" у барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам. Я адказваю: здарылася гэта таму, што некалькі часу таму назад, калі група таварышоў узьняла бой супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, дык ім не далі магчымасьці адкрыта выступіць.

У 1927 годзе тав. Шапавалаў напісаў артыкул на тэму „Шавінізм пад маскай бальшавізму" і, ня гледзячы на тое, што гэты артыкул правільна арыентаваў партыйныя масы ў пытаньнях небясьпечнасьці нацыянал-дэмакратызму, ён надрукаваны ня быў. І толькі зараз ён мае зьявіцца на старонках „Зьвязды". Другі прыклад: Калі тав. Амбрамёнак у артыкуле, які быў зьмешчаны ў „Зьвязьдзе" ў сьнежні 1928 г. паказаў на тое, што нацыяналістычныя выступленьні Жылуновіча не выпадковыя, то „Зьвязда" праз некалькі дзён вымушана была даць заўвагу і нават атрымала за гэта вымову.

Я лічу, што выступленьне ў друку двух членаў ЦК т. т. Бэйліна і Сяньковіча супроць артыкулу Славіна, выступленьне, накіраванае на тое, каб з артыкулу Славіна зрабіць апазіцыйнае выступленьне, няправільнае. Бязумоўна, што ў артыкуле Славіна ў радзе месц была дана няправільная ўстаноўка, але факты ў артыкулах былі правільныя. І калі памянёныя таварышы выступілі супроць гэтага артыкулу агульна, то яны аб'ектыўна памаглі справе затушоўваньня небясьпекі нацыянал-дэмакратызму.

Калі я на XII-м зьезьдзе КП(б)Б выступіў і зьвярнуў увагу партыі на шкодную ідэалізацыю Кастуся Каліноўскага, якога паказваюць, як гэроя сялянскага руху 1863 году, дык мне далі па руках, сказалі, што гэтым ня трэба займацца на зьезьдзе. А тав. Ігнатоўскі сказаў, што тав. Агурскі хваліцца перамогамі, якія ён меў у справе барацьбы з ідэалізацыяй дробна-буржуазных партый. Я таму сказаў, што яны не разьбіты. І зараз уся партыя можа ў гэтым пераканацца. Мы павінны яшчэ весьці жорсткую барацьбу супроць ідэалізацыі нацыяналістычных дробна-буржуазных партый, асабліва—у навучальных установах, дзе атручваюць моладзь нацыяналістычнай атрутай.

* * *

Даклад і заключнае слова тав. Гамарніка будуць надрукаваны ў бліжэйшых №№ „Савецкай Беларусі".

За бязьлітасную барацьбу з галоўнай небясьпекай—правым ухілам, прымірэнцтвам да яго і з „левымі" загібамі.

(Рэзалюцыя сходу менскага партактыву па дакладу тав. ГАМАРНІКА, прынятая аднагалосна.

Заслухаўшы даклад сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Гамарніка аб выніках верасеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, актыў Менскай арганізацыі КП(б)Б ухваляе ўсе пастановы пленуму, які праходзіў пад сьцягам разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, цалкам далучаецца да адозвы пленуму ЦК да ўсіх членаў КП(б)Б і цалкам салідарызуецца з перадавой „Зьвязды" за 8-IX 1929 г.

Актыў з поўным здаваленьнем адзначае, што галоўнейшыя пытаньні будаўніцтва прамысловасьці, сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, уздыму актыўнасьці і вылучэньня рабочых кадраў абмеркаваны пленумам з усёй бальшавіцкай адказнасьцю і сур'ёзнасьцю.

Падагуліваньне вынікаў, якое зрабіў пленум аб працы па сацыялістычным будаўніцтве за мінулы год (першы год пяцігодкі), яскрава сьцьвярджае правільнасьць лініі кампартыі ў справе бязупыннага пасьпяховага будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне і разьбівае дашчэнту ўсю хлусьню правых апартуністых на ленінскае кіраўніцтва партыі.

Мінулы год, які зьяўляўся першым годам па ажыцьцяўленьні вялікага пляну перабудовы краіны, дае нам такія паказальнікі будаўніцтва, якія перавышаюць усе намечаныя пляны. Гэтыя паказальнікі яскрава сьведчаць аб тым, што мы маем усе магчымасьці для пасьпяховага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва і выкананьня пяцігодкі ў скарочаны тэрмін.

Усё гэта яшчэ больш выкрывае беспадстаўнасьць права-ўхілісцкай бухарынскай апазіцыі, якая страціла веру ў здольнасьць пралетарыяту хуткім тэмпам ісьці да будаўніцтва сацыялізму. Усё гэта бязьлітасна б'е правых беларускіх ухілістых, якія тармазілі пасьпяховасьць будаўніцтва, знаходзячыся ў кіраўніцтве НКЗ, сампрамкаапэрацыі і Наркамасьветы.

Актыў ухваляе ўсе ўжытыя меры ЦК па аздараўленьні кіраўніцтва Наркамзему, якое на справе ажыцьцяўляла права-ўхілісцкую тэорыю аб уратстаньні кулака ў сацыялізм, насаджаючы хутары, і сваёй права-ўхілісцкай практыкай спрыяла росту кулацкіх элемэнтаў вёскі, што зьяўлялася адкрытым вызавам партыйнай лініі, што падрывала пасьпяховы тэмп сацыялістычнае рэканструкцыі вёскі, якая тым ня менш шпаркім тэмпам ідзе па шляху калектывізацыі.

Пленум з усёй рашучасьцю выкрыў апартуністых, якія праводзілі правую лінію ў сампрамкаапэрацыі, прыкрываючыся асаблівасьцямі беларускага мястэчка, уцягваючы нэпманаў у каапэрацыю „ў мэтах прыцягненьня іх сродкаў і ініцыятывы ў каапэрацыю", чым разлагалі шэрагі каапэрацыі і нанесілі лўную шкоду пасьпяховасьці наступленьня на прыватніка-нэпмана.

Актыў цалкам ухваляе як ужытыя меры, так і ацэнку, якую даў пленум дзейнасьці Наркамасьветы, дзе сапраўды ня была забясьпечана цьвёрдая клясавая лінія, дзе не давалася рашучага адпору варожай нам ідэалёгіі, дзе кіруючыя працаўнікі не займаліся пытаньнямі выхаваньня пралетарскіх кадраў. Усе вышэй адзначаныя недахопы ў рабоце паасобных органаў зьяўляюцца вынікам таго, што ў арганізацыі ня было выстарчальна разгорнутай сьмелай бальшавіцкай самакрытыкі. „Самакрытыка ў нас ня была ўзьнята на бальшавіцкую вышыню, у нас часта крытыкавалі, „гледзячы на асобы".

Таму перад Менскай арганізацыяй, на вачох у якое адбываліся ўсе гэтыя права-апартуністычныя дзеяньні паасобных членаў партыйнай арганізацыі, стаіць задача яшчэ больш рашуча разгарнуць сьмелую бальшавіцкую самакрытыку, накіраваўшы жорсткі агонь самакрытыкі супроць канкрэтных носьбітаў правага ўхілу, якія ў сваёй практычнай рабоце скрыўляюць генэральную лінію партыі. Разам з гэтым, Менская арганізацыя павінна таксама рашуча змагацца з праявамі трацкізму, з „левымі" наскокамі, тыпу Стэна-Шацкіна, якія, прыкрываючыся самакрытыкай, на самой справе адлюстроўваюць трацкісцкія погляды.

Актыў цалкам згаджаецца з тым, што ў момант разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, пры абвастрэньні клясавай барацьбы, праблема кадраў набывае першачарговае значэньне для ўсёй КП(б)Б.

Таму неабходна з усёй рашучасьцю вылучаць навыя пралетарскія кадры, замяняючы тых, хто няздольны праводзіць цьвёрда ленінскую лінію партыі ва ўсім будаўніцтве.

Актыў заклікае ўсю партыйную арганізацыю да бязьлітаснай барацьбы з правымі ўхілістымі, якія шкодзяць пасьпяховаму правядзеньню лініі партыі, і патрабуе ад ЦК КП(б)Б і ЦК УсеКП(б) прыняцьця ўсіх зхадаў да спыненьня шкоднай дзейнасьці бухарынскай правай апазыцыі ў адпаведнасьці з ранейшымі пастановамі ЦК УсеКП(б).

Актыў лічыць патрэбным прапрацаваць рашэньні верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б ва ўсёй арганізацыі.

За бязьлітасную барацьбу з правымі ўхілістымі!

За разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі!

За рашучае вылучэньне і падрыхтоўку пралетарскіх кадраў!

З непарушным сталёвым адзінствам ленінскіх радоў—за пераможнае будаўніцтва сацыялізму!

ВЫКАРЧОЎВАЕМ НАРКАМЗЕМАЎСКУЮ ХУТАРСКУЮ СПАДЧЫНУ.

БОРКАВІЦКІ РК КП(б)Б І РВК МІНУЛАГА СКЛАДУ БУДАВАЛІ „СТАЛЫПІНСКУЮ" ВЁСКУ.

ТОЛЬКІ АПОШНІ ГОД БЫЎ ПЕРАЛОМНЫМ У БОК КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

ПРАВІЛЬНАЯ КЛЯСАВАЯ ЛІНІЯ Ў ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНІ ДАПАМОЖА ШПАРКАМУ РОСТУ КАЛГАСАЎ.

РАЙЁН У МІНУЛЫМ.

Боркавіцкі райён (ранейшая яго назва Валынецкі),—райён на далёкай поўначы Савецкай Беларусі, на самай мяжы з Польшчай.

Асаблівая яго характэрнасьць у мінулым — значная беднасьць, старыя спосабы вядзеньня сельскай гаспадркі. Аб прамысловасьці няма чаго і гаварыць, бо яе тут і духу ня было.

З гэтага мінулага на сёньнешні дзень засталося яшчэ: вусканалосіца і хутары—два ворагі новай вёскі, дзьве галоўныя прычыны беднасьці і разбурэньня сельскай гаспадркі, але нагул у эканамічным сваім жыцьці Боркавіцкі райён за апошнія два гады далёка рушыўся наперад і магутным тэмпам ідзе далей па шляху калектывізацыі і інтэнсыфікацыі.

«СТАЛЫПІНЦЫ» У РАЙКОМЕ КП(б)Б І РВК.

Скажыце зараз селяніну, які жыве на пасёлку ці ў калектыве аб выдзяленьні яго на хутар, вы атрымаеце адказ, што „лепш пайсьці з торбай, чым жыць на хутары".

Нярэдка хутаране прыходзяць у зямельныя органы з плачам:

— „Ратуйце, пятля на шыі! Ратуйце, сьмерць на носе, душаць хутары".

Вось аб чым крычаць хутаране, гэтыя крыкі, у выніку эканамічнага заняпаду гаспадаркі, нярэдка чулі працаўнікі Боркавіцкага РВК і райкому партыі мінулага складу 1926-27 году.

Але, што ім да трывожных крыкаў абанкрочанага „сталыпіншчынай" сялянства.

Іх лінія ў сельска-гаспадарчым пытаньні—хутарызацыя.

РВК і РК КП(б)Б шчыра праводзілі „сталыпінскую рэформу" мажліва (гэтага нажаль у справаздачах няма) пад плач і енкі насаджвалі хутар на хутар.

Гэта будзе куды яскравей, калі азнаёміцца з земляўпарадкаваньнем мінулых гадоў. Мёртвыя лічбы—няўміручыя факты злачыннай перабудовы вёскі, якую адцягвалі сілай ад сацыялістычнага шляху і сёньня гэтыя жабрацкія хутары зьяўляюцца помнікам для руплівых былых працаўнікоў Боркавіцкага раёну. Трэба сказаць, што гэтыя помнікі, прадстаўленыя плянамі земляўпарадкаваньня урачыста зацьвярджаліся ў акрузе.

Земляўпарадкаваньне 1927 г. пакінула ў Боркавіцкім раёне наступны помнік:

Земляўпарадкавана агулам 2880,28 гэктараў зямлі, альбо 4,92 проц. да агульнай (58430 гэкт.) плошчы раёну.

Формы земляўпарадкаваньня наступныя:

Калгасаў—4 з плошчаю 372,84 гэкт. альбо 0,63 проц.

Пасёлкаў—13 з плошчаю—847,69 гэкт. альбо 1,45 проц.

Хутароў 133 з плошчаю—1500,36 гэкт. альбо 2,57 проц. (!!!)

Рэшта—187,75 гэкт. была прырэзана да вёсак.

Як бачыце, хутары пры земляўпарадкаваньні 1927 году займаюць самы большы процант нават і тады, калі калектывы аб'яднаць з пасёлкамі, але гэтага зрабіць нельга, бо гэтыя маленькія куртатыя пасёлкі хутчэй былі падобны да хутароў

УСЕ СІЛЫ НА РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ Ў ВЁСЦЫ.

ГРАМАДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЗАХАПІЛІСЯ ПОСЬПЕХАМ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ Ў ГОРАДЗЕ ЗАБЫЛІ ПРА ВЁСКУ. ЗНАЧНАЯ ЧАСТКА РАЙЁНАЎ НЕ РАЗГАРНУЛА ПРАЦУ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ СЯРОД СЯЛЯНСТВА.

Некаторыя мясцовыя працаўнікі іграюць у дудку падкулачнікаў. Дамо рашучы адпор кулакам і падкулачнікам, якія спрабуюць сарваць кампанію на вёсцы.

ЛЁЗУНГ—„НІВОДНАЙ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЗ АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ"—ТРЭБА ВЫКАНАЦЬ

Трэба дабіцца пералому.

Дзяржаўны крэдыт для Савецкай краіны ў сучасны момант зьяўляецца адным з важнейшых сродкаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя сродкі здабываюцца ў савецкай краіне праз арганізацыю сярод працоўных гушчаў пазык. Праводзімая намі зараз трэцяя пазыка індустрыялізацыі патрабуе ўдзелу ў ёй працоўных колаў насельніцтва як гораду, гэтак і вёскі.

Выпускаючы гэтую пазыку, савецкі ўрад паставіў перад сабою практычную задачу ўцягнуць у справу індустрыялізацыі краіны працоўных гораду і працоўнае сялянства вёсак. Зразумела, што пасьляховасьць гэтага мерапрыемства будзе расцэньвацца паўнатою ўдзелу рабочае клясы і працоўнага сялянства нашага Савецкага Саюзу і ў прыватнасьці БССР.

Час для правядзеньня гэтай пазыкі застаўся нязначны; 1-га сьнежня канчасцца тэрмін вызначаны для распаўсюджваньня 3-й пазыкі. І ў той час калі ў горадзе мы ўжо здабылі некаторыя практычныя вынікі і набліжаемся да 100 проц. падпіскі вызначанай для гораду, на сёньняшні дзень агульны процант падпіскі на вёсцы налічваецца ня больш 25 пр. з вызначанай для яе даволі нязначнай сумы ў паўтара мілёна руб.

Дзе прычына гэтай слабасьці?

Цэнтральная камісія садзейнічаньня распаўсюджваньню пазыкам, наглядаючы за ходам гэтай кампаніі, знайшла гэтыя прычыны і ў сваіх настановах неаднаразова зазначыла, што ўся сетка камісій па распаўсюджваньню пазык павінна зьявіцца штабам на арганізацыі гэтай справы. Навялікі жаль у асобе сельскай райённай камісіі гэтага штабу ня відаць. Цэнтральная Камісія знаходзіць поўную бязьдзейнасьць камісій садзейнічаньня пры сельсаветах і ў значнай частцы камісій пры РВК, даручаючы адначасова акруговым камісіям прыняць усе захады да ажыўлевьня і актывізацыі іх работы.

Адначана таксама агульная слабасьць растлумачальна-папулярызацыйнай працы ў сувязі з чым і наглядаецца зусім недапушчальны тэмп кампаніі па рэалізацыі пазыкі.

З прычыны бязьдзейнасьці сельскіх і раённых камісій у гэтай справе шырокія колы сялянства не асьвядомлены ў значэньні распаўсюджаньня пазыкі.

Нам вядомы выпадкі, што калі толькі ўзьняліся чуткі праз друк аб пажаданьнях рабочых атрымаць пазыку, беднякі і сераднякі таксама на сваіх сходах досыць часта вынасілі пастановы прасіць Савецкі Урад выпусьціць пазыку, каб тым самым беднаце і сераднятству разам з рабочаю клясаю удзельнічаць у пабудове сац. гаспадаркі.

Гэтыя вельмі карысныя і дзяржаве і самім працоўным БССР жаданьні не падхопліваліся мясцовымі органамі, не папулярызуюцца зараз камісіямі садзейнічаньня.

Гэтаю нядбайнасьцю якраз карыстаецца варожы савецкай уладзе элемант вёскі, тэрарызуе і забівае наасобных савецкіх актывістых па прасоўваньню пазыкі.

Так, 4-га верасьня г. г. адбываўся пленум Грычэвскага с-с Менскай акругі з удзелам актыву, на якім абгаварывалася пытаньне хлебазагатовак і рас паўсюджаньне трэцяй пазыкі індустрыялізацыі. На пленуме сельскага савету вясковы актывісты тав. Фалько высоўваў у сваім выступленьні разам з прапановамі па іншым пытаньням і пытаньне, каб ніводнай хаты не засталося без аблігацый трэцяй пазыкі індустрыялізацыі. Выступленьне тав. Фалько аднадушна было падтрымана беднатой вёскі і актывам серадняцтва.

За яго актыўную працу кулацтва ня раз палохала яго пагрозамі. А ўноч з 4 на 5 верасьня у час пажару у вёсцы Васілеўшчына кулацтва у асобе кулака хутара Васілеўшчына Будая свой агідны нумар выканала. забіўшы тав. Фалько.

Трэба рашуча ўціхамірыць кулака на вёсцы і пэпмана ў горадзе за падобныя зьявішчы, ужыўшы да Будая і ўсіх, хто за ім стаіць самую суровую меру сацыяльнай абароны.

Трэба разам з тым выканаць пастанову Цэнтральнай Камісіі БССР садзейнічаньня пазыкам ад 28 жніўня г. году, якая гаворыць: „ужыць суровыя меры узьдзейнічаньня да ўстаноў і асоб, якія нядбайна адносяцца да рэалізацыі пазыкі, або вядуць супроць яе агітацыю".

Трэба дабіцца ад усіх прадстаўнікоў, арганізацый і ўстаноў садзейнічаньня па зьнкам ад сельсаветаў, РВК і іншых разглядаць сваю працу ў гэтай галіне трэба да гэтай справы адносьціся са ўсёй павагай як да задач дзяржаўнага значэньня, як да мерапрыемстваў спрыяючых і беспасрэдна дапамагаючых індустрыялізацыі краіны.

Кампанія па 3-й пазыцы індустрыялізацыі павінна стаць перагібам у бок масавага ўцягненьня сялянскіх зьберажэньняў у дзяржпазыкі. Для правядзеньня растлумачальнай работы ў камісіі садзейнічаньня павінны быць прыцягнуты ўсе грамадзкія і культурныя сілы вёскі і ўвесь бядняцка-серадняцкі актыў. Ніводны больш менш значны сялянскі сход не павінен прайсьці без таго, каб пытаньне аб 3-й пазыцы індустрыялізацыі ня было пастаўлена і абмеркавана. Кожны селянін павінен ясна ведаць, для якой мэты скарыстоўваюцца сродкі, уцягнутыя у пазыкі. Неабходна растлумачыць ў якой меры гэтыя сродкі будуць дапамагаць пераводу ўсяе сельскае гаспадаркі на вышэйшыя формы яе вядзеньня—калгасы. Кожны селянін павінен ведаць як пазыка дапамагае ажыцьцяўленьню пляну вялікіх работ у сацыялістычнай гаспадарцы.

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і савецкай улады творчыя сілы працоўных гораду і бедняцка-серадняцкіх мас вёскі павінны быць аб'яднаны ў гэтай кампаніі пад знакам экономічнага узросту краіны савета ў і найхутчэйшай перамогі ўсіх цяжкасьцяй, якія сустракаюцца на шляху сацыялістычнай перабудовы усёй народнай гаспадаркі Саюзу ССР.

А. Сташэўскі.

Рабочыя чырвонаштандартнага „Бальшавіка" пакажуць прыклад у рэалізацыі пазыкі.

На пазаўчарашнім пасяджэньні Цэнтральнай Камісіі Садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаднай справе быў абгаворан шэраг дакладаў аб ходзе рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Цэнтральная Камісія першым дакладам абгаварыла справаздачу камісіі садзейнічаньня чырвонаштандартнага заводу „Бальшавік".

Кампанія па рэалізацыі на заводзе „Бальшавік" распачалася яшчэ з 15 ліпеня па ініцыятыве групы рабочых у 30 чалавек, якія патрабавалі ад уряду выпуску новай пазыкі індустрыялізацыі і зараз-жа самі падпісаліся на апошнюю.

Апрача агульна-заводзкой камісіі садзейнічаньня, апошнія на заводзе ўтвораны і на цэхах. На заводзе працуе 800 рабочых, якія ў месяц атрымоўваюць 76.000 руб., падпісалася на пазыку 785 чал. на 75.000 руб., рэшта-ж рабочых знаходзіцца ў водпуску або ў перамённым складзе.

Падпіска па пазыку сярод рабочых 785 рабочых дала 100,6 проц. сярэдняй месячнай зарплаты і на кожнага рабочага прыпадае 95 руб.

Цэнтральная Камісія адзначыла прыхільнасьць рабочых да рэалізацыі пазыкі зьвярнула ўвагу заводу „Бальшавік" на тое, што ён павінен быць прыкладам іншым прадпрыемствам у справе рэалізацыі пазыкі і захаваньня аблігацый ранейшых пазык.

Мы спадзяемся, што рабочыя заводу „Бальшавік" ускладзеныя на іх надзеі выканаюць і дадуць прыклад іншым прадпрыемствам БССР.

Забылі пра рэалізацыю пазыкі на вёсцы

Кампанія па рэалізацыі 3 пазыкі на вёсцы праходзіць наогул вельмі слаба,—з агульнай сумы рэалізацыі па БССР пазыкі ў 11320 тыс. р., сярод сялянства рэалізавана толькі на 383 т. 575 р.

Прычынамі слабага тэмпу рэалізацыі пазыкі ў вёсцы трэба лічыць тое, што нашы грамадзкія арганізацыі захапіліся посьпехамі рэалізацыі ў горадзе сярод рабочых і служачых і зусім забыліся аб вёсцы.

Дырэктывы аб разгортваньні кампаніі па вёсцы дадзены па ўсіх лініях, але дзякуючы таму, што праверкай іх выкананьня да апошняга часу амаль ніхто не займаўся, гэтыя дырэктывы засталіся на паперы і на мясцох у жыцьцё не праводзяцца.

Значная частка райёнаў яшчэ дагэтуль не разгарнула працу сярод сялянства, да такіх раёнаў можна аднесьці Бялынкавіцкі, Чэрыкаўскі, Чырвона-Польскі, Карменскі і Быхаўскі райёны Магілеўскае акругі, Нараўлянскі і Калінкавіцкі райёны Мазырскай акругі і шэраг райёнаў іншых округ. Нарады сельсаветаў праведзены не па ўсіх раёнах, а па некаторых яны праводзіліся фармальна, бо на нарадах адсутнічала большая частка сельсаветаў (Нараўлянскі райён, Мазырычына).

Кепскае абслугоўваньне трымацеляў дзяржаўных пазык на вёсцы з боку крэдытных устаноў і пяўважлівыя адносіны да гэтай працы асобных працаўнікоў выклікаюць пагрозу зрыву наогул працы з фондамі па вёсцы. Трэба думаць, што з боку асобных працаўнікоў раёнаў, якія іграюць ў дудку падкулачнікаў, ёсьць сьвядомыя спробы зрыву фондавай працы. Яскравым прыкладам гэтага можа служыць адмаўленьне загадчыка Астр.-Гарадзецкай ашчаднай касы купіць у сялянкі аблігацыю сялянскай пазыкі у 2 руб. 50 к. нібы з-за адсутнасьці ў касе грошай.

Можна ўявіць да чаго давядзе такі факт, калі мы ўвесь час гаворым, што нашы пазыкі ліквідны, а прыдзе селянін прадаваць сваю аблігацыю, яму кажуць, што няма грошай.

Нельга не адзначыць і таго факту, што ня ўсе РВК кампанію па рэалізацыі пазыкі мічаць ударнай і важнай працай, а таму адносяцца да яе з некаторым прахладцам і на райённыя камісіі садзейнічаньня глядзяць як на непатрэбную і нічога ня робячую арганізацыю. За прыкладамі далёка не хадзіць: старшынёй Калінкавіцкай райённай камісіі зьяўляецца ня толькі ня член РВК, а нават і не супрацоўнік райвыканкому; Капаткевіцкая райённая камісія дагэтуль зусім не працуе.

Наша каапэрацыя, якая шчыльна зьвязана з сялянствам, працай на распаўсюджваньню пазыкі сярод сялянства ня цікавіцца. Часткова вінаваты ў гэтым і самі райвыканкомы, якія не змаглі належным чынам уцягнуць яе ў працу. Нават некаторыя райвыканкомы (Астр.-Гар.) назбавілі каапэрацыйныя арганізацыі магчымасьці праводзіць сярод сялян рэалізацыю пазыкі.

У тых сельсаветах, дзе добра праведзена праца, дзе ў кампанію ўцягнута грамадзкасьць, дзе партыйныя і камсамольскія арганізацыі добра кіруюць працай—рэалізацыя пазыкі сярод сялянства дае станоўчыя вынікі.

Напрыклад: у Скрыгалоўскім сельсавеце, Пятрыкоўскага раёну сэкратар парт'ячэйкі кіруе ўсёй працай і сам ў ёй прымае непасрэдны ўдзел, дык падпіска сярод сялян сельсавету дала 1700 р. і паступілі першыя ўзносы.

Браніслаўскі сельсавет Жыткавіцкага раёну завярбаваў ужо 128 падпісчыкаў на 925 р., актыўны ўдзел прымае настаўніцтва і ячэйка ЛКСМБ. Беляўскі сельсавет таго-ж раёну з 283 гаспадарак завярбаваў падпісчыкамі 266 гаспадарак на суму 1490 р., што складае больш 5 руб. на кожную гаспадарку.

БЛІЖЭЙШЫЯ ЗАДАЧЫ.

У далейшым неабходна, не паслабляючы працы па афарменьню падпіскі ў гарадох, усю ўвагу зьвярнуць на вёску. Трэба шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва як паміж сельсаветамі, так і паміж асобнымі вёскамі. Неабходна шырока папулярызаваць тыя ўмовы, якія сялянства прымае па сацыялістычнаму спаборніцтву і асабліва бядняцкая частка. Такія факты, калі сялянская бедната падпісваецца на пазыку і выносіць пастанову, што гэтым жадае дапамагчы індустрыялізацыі краіны, павінна быць шырока папулярызаваны сярод насельніцтва. Неабходна таксама даць рашучы адпор усім кулакам і падкулачнікам, якія дамагаюцца зрыву кампаніі на вёсцы. Трэба яшчэ раз завастрыць увагу ўсёй грамадзкасьці на ўтрыманьні аблігацый ранейшых пазык, бо інакш самы лепшы посьпех у рэалізацыі 3-й пазыкі можа быць зьведзен на „нет".

Глыбокая растлумачальная праца камісій садзейнічаньня, добрае абслугоўваньне трымальнікаў пазык не павінна падменьвацца мэтадамі прымусу на падпіску.

Перад пачаткам манэўраў.

РАБОЧЫЯ І СЯЛЯНЕ ДАПАМАГАЮЦЬ СВАЙМУ ВЕРНАМУ АБАРОНЦУ АД ПАНОЎ І КАПІТАЛІСТАЎ—ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

БАЙЦЫ І НАСЕЛЬНІЦТВА З УЗДЫМАМ РЫХТУЮЦЦА ДА ЭКЗАМЕНУ БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКІ АРМІІ — МАНЭЎРАЎ.

Удасканаліць вучобу.

(Гутарка з камандуючым войскам Беларускае Вайсковае Акругі тав. Ягоравым).

— Манэўры—казаў тав. Ягораў—заканчваюць сабой гадавы пэрыяд вучобы і зьяўляюцца экзамэнам, падагульваючым вынікі посьпехаў, дасягнутых у галіне баявой падрыхтоўкі часьцей Чырвонай арміі.

З якімі-ж вынікамі гадавой вучобы ўступае войска БВА у правядзеньне манэўраў.

— Я сам назіраў шэраг перадманэўравых заняткаў на складаныя баявыя тэмы. Мэтавая ўстаноўка вучобы гэтага году праходзіла пад адзнакай фактычнага ўдасканаленьня чырвонаармейцаў і начскладу. На працягу ўсяго году войска акругі плянамерна разьвівала на гэтай аснове сваю вучобу. Агульныя вынікі гэтых заняткаў, ня гледзячы на шэраг недахопаў, даюць поўнае права лічыць, што войска ня толькі ўсьвядоміла задачы, але і стала ўжо на практычны шлях усваеньня ўсіх складаных форм тактыкі.

Якія задачы начскладу і байцоў на манэўрах.

— Манэўры зьяўляюцца такой вучобай, якая найбольш набліжае войска да ўмоў баявой сапраўднасьці. У гэтым асноўнае веданьне манэўраў. Зусім натуральна, што гэтыя набліжаныя да баявой сапраўднасьці ўмовы манэўраў выклікаюць з боку як начскладу, так і байцоў праяву вялікіх патрабаваньняў на ўсіх відах баявой службы. На манэўрах самазахаваньне байца і начальніка павінна быць як і ў баю, бо толькі так мы зможам укараніць у нашу сьвядомасьць, у практычныя дзеньні, неабходныя навыкі баявой работы.

Рост баявой тэхнікі няўхільна дыктуе і прыроду боя. Машына і панцыр (авіацыя, танкі, панцыраваныя машыны і інш.)—гэта ня будучая баявая тэхніка, а тэхніка сёньняшняга дню.

Усё гэта разам узятае прад'яўляе войску патрабаваньні ўмець скарыстаць тэхніку і пасьляхова супроць яе бараніцца. Разам з тым гэта тэхніка ўплывае на ўсе віды баявой службы.

На манэўрах нашы патрабаваньні ў асноўным будуць складацца з наступнага. Байцу: першае—разуменьне сутнасьці задачы, другое—выяўленьне дастатковай спароўкі, трэцяе—выяўляць находлівасьць і сьмеласьць дзеяньняў ва ўсіх выпадках баявых абставін.

Начскладу: першае—выразна кіраваць сваёй часьцю, другое—забясьпечыць поўнае ўзаемадзеяньне ўсіх родаў войска і відаў зброі, трэцяе—праяўляць актыўнасьць, ініцыятыву і адвагу ў дзеяньнях.

Баявое сацыялістычнае спаборніцтва, якое пачалося ўлетку г. г., значна спрыяла посьпеху баявой падрыхтоўкі часьцей Беларускае Вайсковае Акругі. На манэўрах нашы часьці павінны разгарнуць спаборніцтва, дамагацца найбольшых посьпехаў на асноўным экзамэне нашай баявой падрыхтоўкі.

Посьпехі чырвонай коньніцы.

(Гутарка з інспэктарам РСЧА т. Будзёным).

У гутарцы з нашым спэцыяльным карэспандэнтам інспэктар Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі т. Будзёны адносна манэўраў сказаў.

Манэўры зьяўляюцца важнейшым іспытам вывучкі часьцей Чырвонай арміі, праверкай посьпехаў зімняй баявой вучобы. Таму да манэўраў павінна быць прыцягнута самая шырокая ўвага працоўных. Дапамога ўсіх арганізацый, савецкае грамадзкасьці дапаможа Чырвонай арміі з посьпехам выканаць ускладзеныя на яе ў пэрыяд манэўраў задачы. Наша Чырвоная коньніца дасягнула ў баявой вывучцы вялікіх посьпехаў. Байцы-кавалерысты навучыліся ня толькі ўладаць капём, шашкай, стрэльбай, але і ўжываць тэхнічныя сродкі.

Уменьне хутка падрыхтавацца да бою, хутка пераходзіць ад коннага бою да пешага і назад, рухавасьць і цьвёрдая рашучасьць давесьці бой да канца сабельным ударам ці штыком—вось тыя запатрабаваньні, якія прад'яўляюцца да кожнага камандзіра і байца. Гэтыя балвыя якасьці і павінна паказаць наша чырвоная коньніца на манэўрах.

З чырвонымі абозамі

У Асіпавіцкім і Жлобінскім раёнах палякі-беднякі і сераднякі да пачатку манэўраў рыхтуюць чырвоныя абозы. Гэтыя абозы будуць спатыкаць часьці Чырвонай арміі. У селішчах з польскім насельніцтвам рыхтуецца ўрачыстае спатканьне чырвоных байцоў.

Па ініцыятыве саміх сялян хутка рамантуюцца масты і дарогі. Сяляне вёскі Заброзьве пастанавілі аддаць на танк імя газэты „Камуніст" тыя грошы, якія яны выручаць за перавозку чырвонаармейскага інвэнтару.

Шмат вёсак пастанавілі бясплатна выдаваць сена для коняй чырвонай коніцы. Зьбіраюцца прадукты для саміх байцоў.

Так актыўна рыхтуюцца беднякі і сераднякі польскіх вёсак да спатканьня сваёй клясавай Чырвонай арміі.

Бабруйскія прафсаюзы—манэўрам

Шырока разгарнуў працу па падрыхтоўцы да манэўраў Бабруйскі савет прафсыянальных саюзаў. Яшчэ ў пачатку жніўня на шэрагу прадпрыемстваў былі праведзены сходы рабочых, на якіх члены прафсаюзаў былі азнаёмлены з мэтамі манэўраў і былі намечаны мерапрыемствы па арганізацыі дапамогі манэўруючым часьцям Чырвонай арміі.

Амаль на ўсіх прадпрыемствах акругі, нават у самых далёка адлеглых мясцох, рабочыя прыступалі да закупкі падаркаў для чырвоных байцоў. Асобна было сабрана сярод членаў прафсаюзаў 15.000 руб. Гэтыя грошы будуць скарыстаны на паляпшэньне бытавых умоў часьцей Чырвонай арміі.

У райёны выехалі рабочыя брыгады, якія аб'яжджалі селішчы, тлумачылі сялянству задачы і мэты манэўраў, адначасова арганізуючы чырвоныя абозы па здачы лішкаў хлеба. У райёны таксама выехала брыгада адказных прафпрацаўнікоў, якія застануцца на месцы для непасрэднага кіраўніцтва працай.

ТДА Авіяхім разаслаў на месцы спэцыяльную ваенную літаратуру, прысьвечаную манэўрам. На прадпрыемствах складзены атрады паветранай абароны.

У сувязі з набліжэньнем манэўраў, на ўсіх сходах рабочых і служачых ухваляюцца пастановы аб тым, каб дзень выхаду чырвонаармейскіх часьцей на манэўры лічыўся сьвяточным днём.

На прадпрыемствах, у грамадзкіх і іншых установах наглядаецца нябывалы ўздым. Горад ілюмінаваны. Вечарам на прадпрыемствах праходзяць вечары змычкі рабочых з чырвонаармейцамі.

Пад штурмам авіацыі.

Загад аб выступленьні АБВШ сумесна з № палком застаў усіх нечакана.

Хутка сфармаваўшы роту, назначыўшы камандзіраў разьдзелаў з курсантаў старшае клясы, школа выступіла на заняткі.

Ротаю камандуе штатны камандзір роты, які на выходным пункце тлумачыць абстаноўку і задачы.

Да сустрэчы з супраціўнікам усе нашы часьці корпусу будуць рухацца ў калёнах у раён, дзе авіацыя супраціўніка мае перавагу над авіацыяй нашай.

Дзеля назіраньня за ветрам высылаюцца ўперад і па бакох назіральныя варты, а дзеля барацьбы з самалётамі кулямётная рота, якая будзе рухацца за кулямётамі ў тры папрамкі.

Частыя выхады ў поле на заняткі стамілі курсантаў і чырвонаармейцаў, але яны ўважліва слухаюць тлумачэньні камандзіраў аб асаблівасьці руху над штурмуючай авіацыяй супраціўніка.

Рушылі.

Праз вецьце сасоньніку зьверху нясецца грухат матораў—гэта нашы самалёты—выведчыкі шукаюць сваіх, каб кінуць вымпел з данясеньнем аб супраціўніку.

— Во, во, во, брат, як нізка ляцае,—чуецца ў наўголаса з калёны, якая ідзе па лесе збоку дарогі. Сталёвая птушка, бліскаючы на сонцы сваімі бліскучымі бакамі, зьнізілася на 50—60 мэтраў, а лётнік-назіральнік назірае ўніз і махае рукой. Яму ў адказ прывітна махаюць зьнізу.

Ад назіральных пунктаў упередзе і з бакоў чутны адзіночныя стрэлы—сыгналы аб паяўленьні выведных самалётаў супраціўніка. Стралковыя роты перабягаюць з аднаго ўкрыцьця да другога да свайго вучастку. Ужо над галавамі кружацца «варожыя» самалёты. Рух спыніўся, роты і батарэі „замерлі" на месцы, але вока лётніка-назіральніка бачыць з вышыні 800-1000 мэтраў, кожны жыве, хоць і замаскаваны рух.

Грукат матораў заціх. Пакружыўшыся ў паветры і здабыўшы патрэбныя зьвесткі аб супраціўніку самалёты зрабілі апошні абруч і зьнікілі.

Выходзім зноў на дарогу і ў калёне рухаемся далей.

Раптам сыгналіст іграе трывогу. Уся калёна праз некалькі хвілін раскінулася на бакох дарогі і замаскавалася пад мэтлікамі жыта, не пасьпела замаскавацца артылерыя, якая і трапіла пад штурм самалётаў „зьнішчыцеляў".

— Во—кідаецца на зямлю—ня вытрымалі некаторыя і крыкнулі, калі ўсе сем самалётаў стралою зьверху накінуліся на артылерыю і людзь не чапляючы калёсамі за галавы коней і артылярыстаў пачалі штурмаваць. Я са стрэльбы яго зьбіў-бы—кажуць некаторыя, калі самалёты, чапляючыся, здаецца, за зямлю, зноў схаваліся. Але і другі раз самалёты зрабілі штурм ужо больш удалы, нечаканы і пераканалі ўсіх у тым, што барацьбу з самалётамі мала весьці толькі зброяй. Заняткі прайшлі цікава, паказалі якое значэньне мае авіацыя ў ваенны час і спосабы барацьбы з ёю: маскаваньне, назіраньне, хуткае ўспрыняцьце сыгналаў паветранай трывогі і арганізацыя агнявой барацьбы з самалётамі. Ідучы ў лягер па калёне чуліся жвавыя гутаркі, кожны апавядаў свайму таварышу свае ўражаньні ад заняткаў.

Пятроўскі.

Ня спыняцца на дасягненьнях.

(Ад нашага карэспандэнта).

Падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі краіны на 1 верасьня па Бабруйскай акрузе дасягнула на гарадзкой падпісцы 106 проц. выкананьня заданьня і на сялянскай падпісцы—48 проц. Агулам падпіска складае 1517 тысяч рублёў. На першым месцы на падпісцы стаіць гор. Бабруйск, які даў 116 проц. выкананьня заданьня па распаўсюжваньню пазыкі. З раёнаў лепш за ўсё пастаўлена праца па распаўсюджваньню пазыкі ў Клічаўскім, Чырвона Слабадзкім, Слуцкім, Любашскім, Асіповіцкім, Рагачэўскім і Сьвіслацкім раёнах. Гэтыя раёны далі перавышэньне агульнага заданьня па падпісцы.

Праўда, выпаўніў заданьне па распаўсюжваньню пазыкі сярод сялян толькі Любаньскі і Чырвона-Слабадзкі раёны.

Такім чынам відаць, што ў распаўсюджваньні пазыкі нашы раёны імкнуліся ісьці і дабівацца не выпаўненьня асноўнай устаноўкі, якая дадзена партыяй і ўладай: правесьці падпіску ня менш як на месячную пэнсію рабочых і служачых і дабіцца таго, каб кожная сялянская хата мела аблігацыю, а дабіваліся толькі колькаснага выпаўненьня заданьня.

Такое становішча мае дрэнныя бакі. Захапленьне папяровай рэалізацыяй пазыкі пакінула ў баку фактычнае афарменьне гэтай падпіскі і на 1 верасьня мы маем наступныя лічбы афарменьня падпіскі. Па гораду Бабруйску аформлена 22 проц. агульнай сумы, па Жлобінскаму раёну—7 проц., па Парыцкаму—70 проц., па Клічаўскаму—29 проц., па Любаньскаму—27 і г. д. Ёсьць раёны, як напрыклад Рагачэўскі і Асіпавіцкі, якія афармілі падпіску на пазыку толькі на 1—1,5 проц.

Цікава прасачыць за тым, як абхоплены падпіскаю калектывы працоўных Бабруйшчыны і які процант пэнсіі асобныя калектывы далі дзяржаве па падпісцы на пазыку. Так, па калектывах савецкіх і гандлёвых служачых падпіска на пазыку дасягнула ста і болей процантаў заработнай платы ахапіўшы амаль што поўнасьцю ўсіх сяброў калектыву. Па прадпрыемствах наглядаецца зусім іншае становішча. Так, па прадпрыемствах Белдзяржбуду падпіскаю ахоплена толькі 50 проц. пэнсіі і 36 проц. рабочых, па прадпрыемству „Цяпло і Сіла"—65 проц. рабочых і 33 проц. пэнсіі, па Акржылсаюзу—20 проц. пэнсіі, па прамініцы 28 проц. і г. д.

Асабліва слаба пастаўлена праца па рэалізацыі пазыкі сярод саматужнікаў—адзінак. Тут падпіска ахапіла толькі 5 проц. агульнай колькасьці саматужнікаў. Ня лепей справа і ў жактах. Жакты далі толькі 4 тысячы рублёў, што, вядома, вельмі і вельмі мала.

З гэтага ўсяго можна зрабіць вывад, што прадпрыемствы гораду Бабруйску, у асабліваасьці прадпрыемствы будаўнічага характару вельмі адстаюць у падпісцы на пазыку. Апрача таго слаба прасоўваецца пазыка на вёску. Крэдытныя ўстановы на вёсцы нічога ня робяць для распаўсюджваньня пазыкі. Слаба праведзена растлумачальная праца аб пазыцы сярод сялянства. Ёсьць шмат вёсак, дзе сялянства нават ня чула пра новую пазыку. Камісіі садзейнічаньня ў раёнах не вядуць сталай і сыстэматычнай працы. Што-ж датычыцца сельсаветскіх камісій, дык праца іх амаль што зводзіцца да нуля.

Адсюль перад партыйнымі, савецкімі, каапэрацыйнымі і іншымі арганізацыямі стаіць задача больш шчыра узяцца за прасоўваньне пазыкі у вёсцы і ў горадзе дабіцца выпаўненьня заданьня ня колькасным выпаўненьнем дадзенай лічбы, а правядзеньнем падпіскі на сто процантаў зарплаты, ахапіўшы поўнасьцю калектывы працоўных падпіскай.

А. Дамброўскі.

Цім. Зарэчны.

Трактарам узьнятая цаліна*)

IV.

Мы ехалі цягнікам. Старыя з сівымі бародамі і марнчыністымі тварамі, мужчыны і жанчыны сярэдніх год—моцныя, буйныя, абветраныя людзі, хлапчукі і дзяўчынкі піанэрскага ўзросту—яны ўсю дарогу ранялі прыгаршні сьмеху на прыдарожныя аўсы, акцябраты—маленькія, пісклівыя стварэньні,—пасажыры нашага поезду.

Чыгунка, на якой мы едзем, не падобна ні да якой чыгункі ў сьвеце. Ні першы цягнік Стэфансона, ні апошняе дасягненьне навукі і тэхнікі—электрычны поезд—ня ведалі і ня ведаюць такой чыгункі. Ні рэйк, ні шпал, ні станцый, ні вакзалаў—звычайная вясковая дарога,—са жвірамі і выбоінамі на кожным сажні, палепшанымі мосьцікамі і размытымі вясеньняй вадой канавамі—эскіз нашае чыгункі.

І цягнік наш ня мае параўнаньня ні з адным цягнікам у сьвеце. Паравоз—трактар «Інтэрнацыянал», вагоны—двое калёс,—адны спэцыяльныя, «трактарныя», а другія звычайныя, сялянскія, праўда на жалезным ходзе. На самым кузаве трактару прымацаваў нехта чырвоны сьцяг з надпісам; „Калектывізацыя і машынізацыя сельскае гаспадаркі—шлях да сацыялізму".

Пасажыры нашы—бойкі народ; нядарма яны сябры камуны „Чырвоны Сьцяг". Ира што толькі яны ня гутараць! І што пагода добрая стаіць, і што канюшыну неабходна яшчэ дзень пасушыць, і што цэглу трэба паліць на абору, і што капуста сёлета нешта „падкачала", і што Пятрусь з Кулінаю хутка возьмуць шлюб.

— І ня ён да сябе возьме яе, а яна прывязе яго ў камуну.

— Хіба ў вас заўсёды робяць так?—запытваюся я.

— Колькі жаніліся нашы дзяўчаты, дык заўсёды ў камуну бралі сабе мужыкоў,—адказвае пасажырка—суседка мая па месцу. Ня хочуць нашы дзяўчаты ісьці ў вёску сярпом жыта жаць, верацяном кудзелю прасьці і скарынку сухую грызьці,—дадае яна крыху спагадзя.

Маршрут наш—суседняя вёска Селішча—цэнтр сельсавету. Там сёньня адбудзецца мітынг, прысьвечаны «Дню калектывізацыі». Сяляне вакольных вёсак прыдуць паслухаць даклад-справаздачу аб жыцьці ў камуне.

Трактар пыхае, гудзіць, застравае ў пяскох і выбоінах. Пазадзі застаюцца выскараджаныя два шнуры—сьляды ад цяжкіх і моцных калёс. А як выходзіць на роўную дарогу, камунары крычаць:—трэцюю скорасьць!—і трактар шпарчэй пачынае падламваць пад сябе шлях—ня справіцца пешшу ісьці з ім.

З абоіх бакоў, аўсы перасьпеўшыя жмуцца да дарогі, бульба ў цьвяту апавядае аб градзе нядаўнім. Грэчка шэравокая просіць параўнаньня з сухотнікам, ячмень мясцовы—„згары, пропадам прападзі"—заяўляе пратэст аб нядбайнасьці свайго гаспадара—бедная, няшчасная трохналёўка, галодная, серадняявковая праспалосіца, дробнаўласьніцкая, некультурная беларуская вёска, брудная, васільковая ідылія, парушаная гулам трактару камуны „Чырвоны Сьцяг".

З права відна была царква. Драўляная, як і большасьць цэркваў на Віцебшчыне, яна схавалася ад сонца ў зеляніну дрэў, толькі купал ды крыж ірдзелі пазалотай. Я, быццам нічога ня ведаючы, спытаў старога:

— У царкву часта ходзіце?

Ён зьдзіўлена паглядзеў на мяне, выняў пінку з насівеўшай барады, лёгка ўсьміхнуўся і ў сваю чаргу спытаў:

— Хіба вы ня ведаеце, што гэта не царква, а клюб «Першае Мая».

Я ведаў аб гэтым яшчэ ў Гарадку, у райвыканкоме, але мне цікава было пагаварыць аб гэтым са старым. І ён пачаў расказваць мне, як яны аднялі царкву, як сходы і спэктаклі ўстрайваюць у ёй.

Камунары яшчэ ў дваццатым годзе былі бязбожнікамі. Бажніц ніколі ня было ў камуне. Праўда, жанчыны часам супярэчылі бязбожнікам—мужчынам, але з цягам часу прынаравіліся, згадзіліся, і зараз самі жартуюць ля вяскоўцаў:—што поп, то й абірала,—дзе царква, там і карчма. Бог папу ды багатаму, а мы самі сабе.

Адняць царкву параныі восеньню 1928 году. Ды й адымаць не ў каго было: абсалютная большасьць так званых „прыхаджан" даўно перасталі быць „авечкамі паствы маёй" і ў кожнай вёсцы і пасёлку выносілі пастановы аб перадачы царквы пад культурна-асьветную ўстанову. Першага мая адбылася ўрачыстая перадача царквы, а таму і клюб атрымаў назву пралетарскага сьвята.

У гэтым-жа годзе па ініцыятыве камунараў адбылася перадача і другой царквы—у самым Селішчы. Там будзе арганізавана 7-годка.

І міжвольна хочацца зрабіць параўнаньне: царква—клюб, царква—7-годка. На месцы пастуха, бяз авечак выступае акторкай якая-небудзь Агрыпіна або Вульяна і юнакі сямнаццацігадовыя дзеці вясковай беднаты, будуць вывучаць хімію, фізыку, аксіёмы і тэорэмы гэомэтрыі.

На дарозе хадзіла худая сялянская каняка. Калі пачула набліжэньне трактару, пачапурыла вушы і спалохана глядзела на ніколі нябачанае па яе вяку відовішча. А потым шарахнулася ў правы бок, па аўсох і грэчках пабегла са ўсіх ног за курган.

Трактар гудзеў, задаволены сваёй перамогай. Машыніст пераводзіў матор на трэцюю скорасьць, і мы ехалі, шпарка ехалі па запыленай, перасохшай дарозе.

У Селішчы быў самы разгар кірмашу. Кірмашоўцы здалёк прыкмецілі машыну і вышлі сустракаць „дзіва дзіўнае".

Заціхлі песьні, маладыя хлапцы—цьвет тутэйшай моладзі—спынілі перагонкі на конях, усе абступілі трактар і ўважліва слухалі даклад, прывітаньні, прамовы.

Выступаючыя расказвалі аб посьпехах камуны і аб цяжкасьцях у працы, аб пераважнасьці калектыўнай гаспадаркі над дробнаўласьніцкай, індывідуальнай.

Вечарам ехалі назад.

Я ішоў разам з Ахрэмам, селянінам суседняй вёскі. Іду і слухаю яго словы:

— Сам я капаюся, капаюся, а працы маёй—ані грош цаны. Камуна-ж, кан

Ад ЦВК БССР.

У газэце „Рабочай" за 12 верасьня 1929 году, № 208 пад назвай „Разоблачим царского верноподданного" зьмешчана заметка аб цёмным мінулым рабочага заводу „Двигатель Революции" СТАЛЯРОВА і запатрабаваньні рабочых заводу, у зьвязку з гэтым, аб выключэньні СТАЛЯРОВА са складу Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

Прэзыдыум ЦВК БССР гэтым раз'ясьняе, што грамадзяніну СТАЛЯРОЎ не зьяўляецца ні членам, ні кандыдатам у члены ЦВК БССР апошняга (IX) скліканьня.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

У ЧЫМ САНІТАРНАЯ НЕБЯСЬПЕКА.

Трэба палепшыць камунальны і санітарны дабрабыт нашых гарадоў.

Асноўнымі элемэнтамі дабрабыту заможных месц, у прыватнасьці гарадоў, лічыцца ў першую чаргу добра наладжаная справа зьбіраньня, выдаленьня і абязшкоджваньня нячыстот і ядкідаў і здаровая вадазабясьпека.

Нажаль мы гэтым пахваліцца ня можам. Неналаджанасьць гэтае справы ў нас залежыць ня так ад „аб'ектыўных" умоў нашае беднасьці, як ад няўважлівых і нядбайных адносін у першую чаргу камунальных органаў, потым жактаў і ўрэшце віна ў гэтым усіх пакрыху. На справу выдаленьня нячыстот звыклі глядзець як быццам на нешта такое, што можа абыйсьціся без усялякага клопату.

Калі паглядзець, што нашы гарады маюць у гэтых адносінах і што зроблена, дык проста неяк ня толькі сорамна робіцца, а нават жудасна. Возьмем для прыкладу нашу сталіцу—Менск. Рэдка вы знойдзеце такі двор, дзе было-б усё спраўна: клёзэты, памыйніцы, сьмяцьцёвыя скрынкі. Апошнія амаль зусім адсутнічаюць. Да клёзэтаў і памыйніц часам страх прыступіцца, каб не запэцкацца ў нячыстоты і не паламаць ногі. Тое, што ня можа ўсмактацца ў зямлю,—праз верх прэ, выпірае на вуліцу. Каля некаторых дамоў ад смуроду па вуліцы прайсьці ня можна не заткнуўшы нос ці ня спыніўшы дыханьня. Ніякая дэзынфэкцыя ня ўжываецца і месцы зьбіраньня нячыстот адначасова служаць месцам выплоджваньня мух, разносчыкаў заразы і ўсё гэта дзеецца ня гледзячы на існуючыя адпаведныя абавязковыя пастановы. Нажаль і ў новым будаўніцтве, капітальных рамонтах і ўпарадкаваньнях домаўладаньняў гэта „маленькая і дробная" справа не заслугоўвае ўвагі.

Паглядзеце вы каштарысы нашых жактаў як па рамонту, так і па будаўніцтву і вы за рэдкімі выключэньнямі знойдзеце грошы на санітарнае ўпарадкаваньне домаўладаньняў. Падобнае зьявішча нагляданца па ўсіх нашых гарадох, як аб гэтым сьведчаць паведамленьні санітарных дактароў, і апошнім выездам інспэктара санітарнай часьці НКАЗ.

Яшчэ горш справа з вывазам нячыстот і іх абязшкоджваньнем. Ня гледзячы на ўсе дамаганьні ў гэтых адносінах санітарныя арганізацыі справа з месца ня руцыцца. Асэнізацыйныя абозы ні ў якім разе ня могуць задаволіць патрэб гораду, у выніку чаго, па даных сан. нагляду, вывозіцца ў сярэднім усіх нячыстот каля 5 проц. Рэшта забрудняе глебу гарадоў, ваданосныя гарызонты, якія служаць для водазабясьпекі і наогул стварае антысанітарныя ўмовы нашага быту, з якімі зьвязана распаўсюджваньне розных інфэкцыйных хвароб, у прыватнасьці брушнога тыфусу і крываўкі. У Мазыры, напр., па даных ЦСУ за 1926-27 г. мелася ўсяго 1 сьмяцьцёвая скрынка і 1 дзежка, здаецца і цяпер ня лепш, а між тым Мазыр акруговы горад(!). У Менску 26 дзежак, але гэта нішто ў параўнані з патрэбамі.

Вывазімыя нячыстоты часта не пападаюць на належнае месца абязшкоджваньня, а вылёваюцца дзе папала, абы ніхто ня бачыў. Да рэчы кажучы, большая часьць нашых гарадоў, у тым ліку і Менск ня маюць належна пабудаваных і эсплёатуемых палёў асэнізацыі і звалачных месц.

Сучасныя выбухі эпідэмій на брушны тыфус і крываўку ў большай меры залежаць ад вышэйазначаных прычын. Забрудняецца ня толькі вада, але і прадукты харчаваньня (праз мух, пыл і іншым шляхам), што і зьяўляецца якраз асноўнай прычынай узьнікненьня і распаўсюджваньня гэтых страўнакішэчных інфэкцый. Ня гледзячы на асаблівую пагрозу ў гэтым годзе на пашырэньньне брушнога тыфу і крываўкі, якая залежыць яшчэ ад натуральных біолёгічных фактараў, нашы камгасы, ЖАКТы і наогул домаўладаньні гэта як быццам іх не чапае. Як цякло, так і цячэ праз верх, ня кажучы ўжо аб іншых няспраўнасьцях. Працячэ крыху—што ў зямлю ўбярэцца, а што і за нагамі разьнясецца. Рабочыя скардзяцца, часта дарма вінавацяць сан. арганізацыю.

Ніякія меры мэдыцынскае прафілякты-не дапамогуць у агуле пры сучасным становішчы. Чыстка хатняга быту і грамадзкага—вось папераджальная мера ад усякіх заразьлівых хвароб.

У лютым месяцы г. г. па дакладу НК Аховы Здароўя „аб санітарным становішчы рэспублікі" СНК прапанаваў АВК наладзіць справу зьбіраньня, выдаленьня і абязшкоджваньня нячыстот і адкідаў, але нажаль пакуль што справа ня рушылася, відаць камунальныя органы ніяк не раскачаюцца, абавязкам якіх зьяўляецца арганізацыя ўсяе справы

У 5 гадовым пляне выдаткі ў параўнаньні з патрэбамі на гэту справу зусім невялікія, што трэба паправіць.

Зараз-жа, неадкладна, мы павінны ў ударным парадку заняцца чысткай нашых гарадоў і належным утрыманьнем іх, гэта і будзе асноўным ударам па выбухах брушнога тыфусу і крываўкі. Санітарная арганізацыя на мясцох павінна даць адпаведныя ўказаньні і весьці агульны нагляд. Праз міліцыю павінны быць праверены ўсе домаўладаньні, ня выконваючыя існуючых санітарных правілаў у гэтых адносінах, павінны быць працягнуты да адказнасьці.

Д-р Магілеўчык.

„Сіняя блюза".

(2 першыя спэктаклі).

Саветызацыя эстрады, барацьба са старым „клясычным" рэпэртуарам і запаўненьне яго новым, злабадзённым зьместам зьяўляецца зараз баявой задачай тэатру эстрады.

„Сіняя блюза" толькі напалову выканала гэтыя задачы. Я кажу аб першых двух спэктаклях, у якіх амаль пры адналковай праграме, сапраўдным дасягненьнем зьяўляюцца толькі 3—4 нумары.

„Вася Курыцын едзе прыстрайвацца" цікавы тым, што на досыць зьбітую тэму абудаваны вельмі добры вадэвіль. Надзвычайна здольны актор Тусузаў, сваёй ігрой у псыхалёгічным пляне (як ня дзіўна!) стварыў фігуру пралазьлівага і ашуканскага ханжы, які пускае ў ход усе сродкі, каб прыстроіцца „без пратэкцыі". Вельмі добрыя інтэрмэдыйныя месцы (4 жанчыны ў перапынках паміж эпізодамі). Выключна дасьціпны нумар танцаў з пераапраньнем. Але ён ня толькі дасьціпны. Ён поўны глыбокага сэнсу, які выяўляецца ня толькі ў тэмпэрамэнтным выконаньні танцаў, але і самая пасьлядоўнасьць іх нясе ў сабе кантрастную апраўданасьць.

Салённыя рухі японскага танцу, набліжаючага нас да манархічнай, жаманнай Японіі; імпэнтныя, расхлябаныя і складаныя рухі распадаючагася Захаду і наша рэвалюцыйнае і вельмі простае „Яблочко".

Гэты нумар ды пародыя на „клясычную" эстраду самыя цікавыя месцы ў спэктаклі.

У „Братьях Удальцовых" пародыруецца стары спосаб паказваць „народ" непраходна дурнымі ёлупамі. Гэты нумар так старанна апрацаваны, што самыя дробныя рухі акторaў даходзяць да гледача.

І, нарэшце, апавядальміца ды „Уборка", якія ўяўляюць сабой мала арыгінальнага, але даюць добрае па мастацтву выкананьне. Вось тыя асноўныя і патрэбныя шляхі, па якіх ідзе „Сіняя блюза". Але ня гледзячы на гэта, яна яшчэ знаходзіцца пад уплывам старога „клясычнага", які яны стараюцца парадыраваць. Сьпявак Авер'янаў нікуды ня годны вельмі няўдалы і наскрозь апэрэтачны ўвесь першы нумар. Тут ня толькі „слашчавы" тэкст у раманскім духу, але месцамі зусім бяз сэнсу („Прыказ капітана", „Волны есть волны"), тут і музыка і ўсе рухі не абумоўлены ніякім зьместам.

Некалькі слоў аб гэройстве матросаў, вельмі недарэчы ўстаўленых яшчэ больш псуе выступленьне.

Тое-ж можна сказаць аб „сьпевах і скоках народнасьцяў СССР", якіх няма фактычна ў нумары. Ні мовы, ні скокаў ніводнай народнасьці „Сіняя блюза" ў сапраўднасьці не перадае.

Апошнія выступленьні яшчэ больш зьбітыя і ўжо зусім ня цікавыя.

Але тыя нумары, аб якіх гаварылася ў пачатку нашага артыкулу, дастаткова даводзяць, што ў „Сіняй блюзе" ёсьць добра азначаны, бязумоўна, верны шлях, і трэба думаць, што ў зусім недалёкай будучыне яна здасе ўвесь непатрэбны і шкодны матар'ял, які мусіць ужо стаіць у чарзе да „адстаўкі". У двух спэктаклях не асабліва яскрава, але ўсё-ж такі прадстаўлена будучая савецкая эстрада.

Р. Г.

ХРОНІКА.

Зварот дэлегатаў працоўных Польшчы.

Сёньня ў Менск зварочваецца з Віцебску і Барысаву дэлегацыя працоўных Польшчы, Заходняй Беларусі і Украіны.

Удзень дэлегаты правядуць гутарку з старшынёй ЦСПСБ т. Рыжовым па пытаньню аб працы прафсаюзаў Беларусі.

У наступным сэзоне пачнецца будаўніцтва тыпізаванай друкарні.

НА БУДАЎНІЦТВА БУДЗЕ ЗАТРАЧАНА 2.389.000 РУБ. ДРУКАРНЯ БУДЗЕ АБСТАЛЯВАНА ПА АПОШНЯМУ СЛОВУ ТЭХНІКІ. У БУДЫНКУ ДРУКАРНІ ЗЬМЕСЬЦЯЦЦА ЎСЕ РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТ І ЧАСОПІСАЎ.

Праграма 5-цігадовага разьвіцьця выдавецкай, газэтнай, часопіснай і наогул друкарскай справы патрабуе амаль поўнага аднаўленьня і значнага пашырэньня існуючых у Менску друкарняў.

У зьвязку з цеснымі памяшканьнямі, існуючыя ў Менску друкарні ня маюць магчымасьці пашыраць сваю вытворчасьць, а таму паўстала пытаньне аб пабудове новай тыпізаванай друкарні.

Новая тыпізаваная друкарня павінна будзе абслугоўваць Белдзяржвыдавецтва, усе менскія газэты і часопісы, што дасьць магчымасьць поўнасьцю скарыстаць тэхнічнае абсталяваньне друкарні і зьнізіць сабекошт прадукцыі на 36,7 проц. супроць бягучага году.

Арыентыровачны кошт будынку тыпізаванай друкарні з яе абсталяваньнем вылічан у 2.389.000 р., з якіх 762.000 руб. пойдзе на дадатковае да існуючага абсталяваньне.

Будынак мяркуецца пабудаваць аб'ёмам у 50—55000 куб мэтраў,—у 4—5 паверхаў. У гэтым будынку будуць зьмешчаны апрача друкарні з усімі яе цэхамі рэдакцыі ўсіх цэнтральных газэт і часопісаў апарат Белдзяржвыдавецтва, яго кніжная база, сталоўка для рабочых, памяшканьні для завкому, мясцкомаў і інш. Калі дазволяць сродкі будзе пабудаваны і клюб.

Усе прадпрыёмствы друкарні будуць пабудаваны і абсталяваны па апошняму слову тэхнікі. Праэктаваньне будынку тыпізаванай друкарні даручана аднаму з буйных спэцыялістаў гэтай справы, які ў бліжайшыя дні прыяжджае ў Менск, каб высьветліць на месцы некаторыя дэталі і падрабязнасьці будаўніцтва.

Для будаўніцтва друкарні ўжо вызначан вучастак зямлі на Нова-Маскоўскай вуліцы плошчай прыблізна ў 12.000 кв. мэтраў. Райён для пабудовы друкарні абраны вельмі ўдала: папершае—друкарня будзе блізка знаходзіцца ад пасажырскага і таварнага вакзалаў, што зьменшыць выдаткі на транспарт, падругое, гэты райён знаходзіцца блізка ад будучага Дому Ураду, дзе будуць зьмяшчацца амаль усе наркаматы.

Будаўніцтва тыпізаванай друкарні распачнецца з наступнага будаўнічага сэзону і мяркуецца, што яно будзе скончана да кастрычніка 1931 году.

Да дню ўраджаю і калектывізацыі.

Выпуск спэцыяльнай літаратуры.

Наркамзем мяркуе выпусьціць да дню ўраджаю і калектывізацыі 100000 экзэмпляраў лістовак-адозваў і 10000 экзэмпляраў часопісі „Шлях калектывізацыі".

Адбор экспанатаў.

Менакрфа распрацоўвае плян адбору экспатаў на райённых выстаўках для ўсебеларускай с.-г. выстаўкі. Намячаецца адбор экспанатаў па культурах паляводзтва і ткацтву.

Удзел камітэтаў узаемадапамогі.

ЦК КСТУ разаслаў усім райённым КСТУ дырэктыву аб актыўным удзеле КСТУ ў надыходзячым дню ўраджаю і калектывізацыі. Усе камітэты ўзаемадапамогі павінны дапамагаць арганізацыі с.-г. выставак, праводзіць падрыхтоўчую працу па шырокаму правядзеньню калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Самае юрыдычнае афармленьне гэтых калектываў адбудзецца ў дзень ўраджаю.

Хутка пачне дзейнічаць трамвай.

Гарсавет атрымаў паведамленьне з Масквы, аб тым, што ў канцы верасьня ў Менск прыбудуць 5 трамвайных вагонаў, рэшта 5 вагонаў прыбудуць не пазьней 10-га кастрычніка.

Прэзыдыум гарсавету даў заданьне кіраўніцтву трамвайнага будаўніцтва ўжыць усе захады, каб можна было адразу распачаць рух трамваю, як толькі будуць атрыманы вагоны.

Новыя праграмы для пэдтэхнікумаў.

Мэтадком НКА пераапрацаваў і дасылае на месцы праграмы для пэдтэхнікумаў па прыродазнаўству, эканамічнай геаграфіі, літаратуры, палітэканоміі і гісторыі клясавай барацьбы.

У праграме па прыродазнаўству значнае месца адведзена пытаньням калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Апрача таго распрацоўваецца асобная праграма—асновы сельскай гаспадаркі і калектывізацыі, якая зараз знаходзіцца на ўзгадненьні ў Наркамземе.

Праграма па прадметах пэдагагічнага цыклю на гэты год застаецца бяз зьмен.

Прыём у польпэдтэхнікум.

Наркамасьветы вырашыў сёлета не адчыняць роўналежага курсу пры менскім пэдтэхнікуме з выкладаньнем на польскай мове.

Побач з гэтым вырашана павялічыць норму прыёму на першы курс да 50 чал. пры ўмове захаваньня курыяльнай сыстэмы.

Рабочых і батракоў—у фізкультурны тэхнікум.

Культаддзел ЦСПСБ даў дырэктывы цэнтральным праўленьням саюзаў і акрпрафбюро павесьці растлумачальную працу сярод рабочых, асабліва членаў фізкультурных гурткоў аб правілах прыёму ў фізкультурны тэхнікум, які адчыняецца ў Менску.

Неабходна прыняць усе меры, каб фізкультурны тэхнікум укамплектаваць выключна рабочымі і батракамі.

Усесаюзная нарада па пытаньнях аргпрацы прафсаюзаў.

УсеЦСПС у сярэдзіне лістападу склікае ўсесаюзную нараду па арганізацыйнай працы прафсаюзаў.

ЦСПСБ-даў на месцы ўказаньні разгарнуць падрыхтоўчую працу да гэтай нарады. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на буйных прадпрыёмствах па пытаньні масавай працы.

Укамплектаваньне дашкольнага тэхнікуму.

З 1 кастрычніка ў Менску адчыняецца першы ў БССР дашкольны тэхнікум. На першы курс тэхнікуму будзе прынята 45 чалавек. Укамплектаваньне дашкольнага тэхнікуму скончыцца да 25 верасьня, а з 1 кастрычніка пачнуцца заняткі. Заняткі тэхнікуму будуць праходзіць у адным з Менскіх пэдагагічных тэхнікумаў.

Цікавая вынаходка.

У канцы жніўня 1929 г. гр-н в. Студзенца, Касьцюковіцкага райёну ў возеры „Жадунка", купаючыся знайшоў нейкую вялізную галаву ў 50—60 кгр. вагай, бівень пры галаве (адламаны) вялічынёй у 2—2,5 м., рабро (моцнае) у 1,2—1,4 м., 4 зубы (па два сядзяць разам—адзелены перагародкай) вялічынёй см. у 30—35, таўшчынёй у 18—20 см., формы рэбрыста-круглай. Зубы вельмі моцныя (здалёка падобны на жалеза).

Галава цікавая (мяркуюць мамантава). 6-IX галава была здадзена саюзу паляўнічых у Касьцюковічы для перадачы ў музэй.

Не паслабіць барацьбу з эпідэміяй тыфусу.

Пабудова станцыі па спальваньні сьмецьцяў.

Гэтымі днямі пры НК Аховы Здароўя адбылася нарада па пытаньню барацьбы з кішэчнымі хваробамі.

Нарада адзначыла, што да гэтага часу аддаецца недастатковая ўвага пытаньням барацьбы з эпідэміяй з боку савецкіх і грамадзкіх арганізацыяй. Вучастковыя і райённыя ўрачы прымаюць слабы ўдзел у барацьбе супроць эпідэміі.

Нарада адзначыла як дадатны момант, што т-ва „Чырвоны Крыж" сваечасова прыняло захады супроць распаўсюджваньні хвароб, праз правядзеньне прышэпак і г. д.

НК Аховы Здароўя завастрыла ўвагу акруговых інспэктароў на неабходнасьць шырокай папулярызацыі сярод насельніцтва мэтатаў барацьбы з хваробамі, праз правядзеньне гутарак нарад; узмацненьне санітарнага нагляду за кірмашамі, сталовымі, дварамі і г. д.

Нарада ўзьняла пытаньне перад адпаведнымі арганізацыямі аб адтэрміноўцы водпуску мэдпэрсаналу на час эпідэміі.

Нарада ўзьняла пытаньне аб уключэньні ў 5 гадовы плян аховы здароўя пункт аб пабудове ў Менску цэнтральнай станцыі па спальваньню сьмецьцяў.

* * *

Прэзыдыум гарсавету пастанавіў асыгнаваць 3000 руб. дапамогі на барацьбу з пошаснымі хваробамі ў г. Менску. На гэтыя сродкі мяркуецца павялічэньне ліку ложак у 3-й бальніцы і пашырэньне прышчэпак ад брушнога тыфусу.

Менск будзе забясьпечаны гароднінай.

Гэтымі днямі на пасяджэньні гандлёва-каапэрацыйнай сэкцыі Менгарсарету быў заслуханы даклад прадстаўніка МЦРК т. Іза кава абходзе загатоўк гароднины і садавіны для г. Менску на зімовы і вясеньні пэрыяды. Усяго мае быць загатоўлена 7.610 тон гароднины на агульную суму ў 264.000 р., (у два разы больш, чым летась). З гэтае колькасьці мае быць бульбы—4800 тон, буракоў 200 тон, морквы—100 тон, капусты кіслай—480 тон, сьвежай капусты —200 тон, таксама будзе засолена 1 мільён шт. гуркоў.

У часе спрэчак па дакладу прадстаўніка МЦРК члены сэкцыі выказалі цэлы шэраг недахопаў у справе забясьпячэньня гароднінай спажыўца. Адмячалася, што акраіны слаба забясьпечаны гароднінай, у крамах, дзе яна прадаецца, назіраюцца вялікія чаргі, прадукты захоўваюцца нездавальняюча і г. д.

Сэкцыя вынесла пастанову, каб пры будаўніцтве крытых базараў на Сьвярдлоўскім рынку і Парыскай Камуны былі арганізаваны спэцыяльныя крамы гароднины. Тут-жа трэба пабудаваць адмысловыя склады для захоўваньня гароднины.

Адначасна з гэтым, МЦРК павінен ужыць захады для пашырэньня сеткі спэцыяльных крам з продажам гароднины на акраінах.

Усебеларуская культнарада рабочых харчавікоў.

10 кастрычніка ў Менску склікаецца ўсебеларуская культнарада рабочых харчавікоў.

Нарада абгаворыць пытаньні і аб сацыялістычных спаборніцтвах і аб перавороту прадпрыёмств на безперар ўны рабочы тыдзень.

Транспартнікі ліквідуюць няпісьменнасьць.

Прэзыдыум ЦП саюзу транспартнікаў парашыў у бягучым навучальным годзе ліквідаваць няпісьменнасьць сярод 600 рабочых, сярод якіх 150 маланісьменных.

На адчыненьне лікпунктаў адпушчана 3.000 рублёў.

За ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны ва ўстановах.

Як паведамілі нашага супрацоўніка ў ў Наркампрацы, Саюзны НКП зацьвердзіў новыя правілы ўнутранага распарадку для дзяржаўных, каапэрацыйных і грамадзкіх устаноў.

Новыя правілы прадугледжваюць значнае ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны. Правілы прадугледжаюць суровыя пакараньні за вандраваньне супрацоўнікаў без патрэбы па ўстанове, за чытаньне ў час працы газэт, за сыстэматычнае спазьненьне на працу, за прыватныя гутаркі па тэлефону і г. д.

Рабселькоры нам пішуць.

ЦЯПЕР МЫ ПАВЕРЫМ...

Цяпер мы паверым, што няма дрэннае зямлі—ёсьць толькі дрэнныя гаспадары—кажуць сяляне акалічных вёсак, пабачыўшы добры ўраджай жыта, якое было пасеяна на тарфяніку ў вёсцы Зайцава, Коханаўскага раёну Аршанскае акругі. Там, дзе было раней непраходнае балота, цяпер, дзякуючы зробленай мэліярацыі, жыта дае ўраджай, сам 13.

П—скі.

ШКОДНІКІ САЮЗУ РАБОЧАГА З СЕЛЯНІНАМ.

Лепельскі саюз будаўнікоў на агульным сходзе сваіх сяброў вынес пастанову, каб не падпісвацца на сялянскую пазыку.

— За што? За якое ласкі мы будзем дапамагаць сялянам, ня трэба—крычаць лепельскія „патомственныя дваране" з лагеру... „нэпаў". Вельмі спрытна вылучыў лепельскі саюз будаўнікоў людзей у рабачыя брыгады на вёску. У ліку гэтых вылучаных апынуліся сыны б. вураднікаў, прыставаў—не сябры саюзу. Як яны будуць „працаваць", адгадаць ня трудна.

А. .Я

КУЛАК НЯ СУПЫНЯЕЦЦА.

Кожнаму селяніну Чэрвенскага раёну вядомы кулак Сьвірыноўскі Ёсель, які ўсімі спосабамі абкрадаў ваколічнае насельніцтва, маючы вялікі млын. Цяпер, каб захаваць за сабою гэты млын, Цітвянскі йдзе ў калгас Птыч. Тут ён вядзе шкодную палітыцу, агітуе, каб млын адчыніць і зрабіць яго загадчыкам, дзе ён ізноў будзе рабіць свае „справы".

Прасторны.

У ШКОЛУ СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ—„НЭПЫ" І КУЛАЦКІЯ ДЗЕЦІ.

Дзякучы слабаму кіраўніцтву даманавіцкай ячэйкі КП(б)Б загадчык школы сялянскай моладзі б. с-р. Малашчыцкі набірае ў школу дзяцей кулакоў і розных нэпаў. Ячэйка гэтым ня цікавіцца.

Н. Л.

РАБАЧКОМ СЬПІЦЬ!

Рабачком савгаоу „Вусьце", Аршанскае акругі не вядзе ніякай культурнай працы сярод рабочых савгасу. Рабачыя не заключылі з адміністрацыяй калектыўнае ўмовы, ня маюць дню адпачынку. Старшыня рабачкому т. Жданоў усё абяцае ўзяцца за працу, думаючы, што абяцанка цацанка...

Ня ведаем, як яго разварушыць—заяўляюць рабочыя...

Камар.

ГІДРА-ТЭХНІК СТРАХАЎ ЗРЫВАЕ МЭЛІАРАЦЫЮ.

У вёсцы Валіцічы, Барысаўскага раёну праведзена земляўпарадкаваньне ў 1926 годзе, а мэліярацыя яшчэ та праведзена. Барысаўскі РВК па за пасылкоўцаў прыслаў гідра-тэхніка Сахава, які паставіў справу так, што не разваліў мэліярацыйнае тавары. Мэліярацыі ён так і не правёў, спалаючыся на тое, што вельмі высокі ём ракі і няма куды пусьціць вады лот. У РВК заявіў, што трэба гэту ву ліквідаваць, што сяляне ад мэліцыі адмаўляюцца. У самай-жа рэчы, сяляне, як адзін, падалі заяву аб гаасьці арганізаваць другое тавары ў іншых пасёлках.

С.

ЗАВЯЛАСЯ ВАРОЖКА...

У вёсцы Мінкавічы, Ніваводворск сельсавету, Старадарожкага раёну, Б руйскай акругі завялася варожка. Ц ныя, адсталыя сяляне, за 100 кілёмэт прыходзяць варажыць, нясучы ёй апо кусок сала, палатна і г. д. Завоз вялікі, што „наведвальнікі" чакаюць ч па 3—4 дні. Міліцыя наша і асьвет сілы раёну сьпяць.

Сялькор В. С-чы

ПАСТАНОВУ РВК ТРЭБА АДМЯНІЦЬ.

У 1926 годзе Горацкім РВК быў пе дадзены сад дзяка Бабіча Горскай жарнай дружыне. Сад быў прыведзе дружынаю ў культурнае становішча. 1927 годзе гэты сад перадаў Золат ў карыстаньне Закурдаеву — вартаўні вучпункту. Сад пусьце, нішчыцца. І жарная дружына хадайнічае перад І рацкім РВК аб звароце ёй саду, а РВК „глух і нем".

Сялькор

МНЕ НЯМА ЧАСУ...

У Даманавіцкім сельсавеце Калінкавіка гага райёну хлебазагатоўчая кампа зусім не праводзілася ня гледзячы тое, што ёсьць многа партыйных, камс мольскіх і прафсаюзных сіл.

Усе сьпяць: і ячэйка КП(б)Б і ячэй камсамолу. А калі сяляне без усяк агітацыі самі прывязьлі ў каапэрацы здаваць хлеб, дык загадчык крамы Ко ман сказаў: „А, ня дурыце мне галав я не маю часу прымаць". Такім чын хлеб апыніўся ў прыватніка. Хлебазагато чая кампанія, калі гэтак будзе дале праваліцца...

Вона.

На Данбасе патрабуецца шмат рабочых.

Як паведамілі нашаму супрацоўніку ў Наркампрбцы, на Донбасе зараз адчуваецца вялікі недахоп у горнарабочых: забойшчыках, крэпільшчыках і інш. кваліфікацыях.

На Донбас запрашаюцца на работу ўсе тыя рабочыя, якія раней працавалі ў шахтах. Пры прыезьдзе на месца рабочым зараз-жа даецца жыльлё, а харчаваньне адпускаецца па павялічанай норме.

Тыя з рабочых, якія прыедуць на Данбас да 15 кастрычніка, атрымаюць сродкі на пераезд ад адміністрацыі капальняў.

Пасылка рабочых у Данбас праводзіцца выключна біржамі працы і карэспандэнскія пункты.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 14-е ВЕРАСЬНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад
1 6 проц. выйгр. паз.	4.91	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	126.70	128 70
Выйгр. пазыка 1929 г.	102.10	102.50
10 проц. выйгр. паз. 1927 г.	25.28	25.38
3-я сялянск. выйгр. паз. 1927 г.	5.03,5	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.37	10.72
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.74	25.84
„ „ „ „ проц.	25.46	25.56
2 „ „ „ 6-проц.	25.82	25.92
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	100.38	100.43
21 проц. рэнтная пазыка 1927 г.	103.36	—

НОВЫЯ КНІГІ.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. „У Нетрах Усырыйскага краю" В. Асеньней. Скарочаны пераклад з расейскай мовы, М. Гарэцкага. Стар. 193, цана 1 р. 40 кап.

2. „Даведнік калектывістага". Склаў А Балтынь. Стар. 133, цана 50 кап.

3. „Дэталізаваная праграма матэматыкі для „Пэдтэхнікуму Дома". Народны Камісарыят Асьветы БССР. Навукова-метадолёгічны К-т. Стар. 39, цана 35 кап.

4. „Бульба". А. Дзямідовіч, Стар. 5 цана 28 кап.

Апавяшчэньні.

Дом камуністычнай асьветы імя Карла Маркса.

У суботу 21 верасьня—адчыненьне Дому А 8 гадз. увечары адбудзецца вечар парт актыву з наступным зьместам:

а) Уступнае слова тав. Цэнцыпера.

б) Даклад заг. АПАД ЦК т. Сяньвеш аб задачах тэорытычн. выхаваньня парт актыву.

в) Концэрт.

Білеты атрымоўваюцца па партячэйках.

ДОМ АСЬВЕТЫ. — Сёньня адчыненьне зімнага сезону—вялікі канцэрт. Пачатак 9 гадз. увеч. Білеты па групкомам і м-в у нядзелю у 7 гадз. пасяджэньне праўленьня дому.

Часова выкон. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ

САВГАС БАБЫ ПУХАВІЦКАГА РАЙЁНУ, МЕНСКАЙ АКРУГІ АБ'ЯЎЛЯЕ ТАРГІ

на здачу падраду на пабудову новага дзеравянага дому на 4-ы кватэры на 15-е верасьня 1929 г. а 12 гадзіне дню у савгасе Бабы. Аб умовах можна азнаёміцца ў канторы савгасу штодзённа.

Кіраўнік савецкай гаспадаркі Бабы ВІЛЬЧАК.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.

АПОШНІЯ СПЭКТАКЛІ.

ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ

Субота, 14-га верасьня.

„ЯРМОРКА НЕВЕСТ"

у 3-х дзеях, ЯКОБІ.

Пачатак а 8 з пал. гадзіне.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Ад панядзелка 9 верасьня Ксенія Дэсьні у блёскучай камэдыі вытворчасьці „УФО" НЯВЕСТА БОКСЭРА

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71. Ад аўторка 10 верасьня—НОВЫ БЫТАВЫ ФІЛЬМ „НЕ ПО ПУТИ" (УКЛОН) маст. быт. драма. рэж. М. Царэшчанка. У галоўных ролях: В. Ванін, Сміранін, К. Куранін. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ВЯДОМАГА САТЫРЫКА ЛЬВА БРАУНА зусім новы рэпэртуар. ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ А 8 Г. 30 ХВ.—КАСА З 7 ГАДЗ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА". Ад панядзелка 9-га верасьня буйны гістарычны фільм „Джанкі" У 7 ЧАСТКАХ.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР". Ад панядзелка 9 верасьня новы фільм БЯСПРЫТУЛЬНЫЯ. Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дню. Пачатак 1-га сэансу а 3 гадз. 30 хв., 2-га а 5 гадз. ПА НЯДЗЕЛЯХ кіно адчынена ад 12 гадз. дню. Цана білету 10 кап. Месцы нумараваныя.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. Ад панядзелка 9-га верасьня па прычыне вялікага посьпеху 2-гі тыдзень ПАТ І ПАТАШОН у замежным фільме. СІЛА і ХАРАСТВО арыгінальная камэдыя ў 6 частках. ПАЧАТАК 1-ГА СЭАНСУ А 7 З ПАЛ. ГАДЗ. УВЕЧАРЫ Каса адчынена ад 6 гадз.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва

У ХУТКІМ ЧАСЕ ВЫЙДУЦЬ І БУДУЦЬ У ПРОДАЖЫ

НАСТУПНЫЯ ПАДРУЧНІКІ:

1. САЗОНАЎ і ВЯРХОЎСКІ—Хэмія.
2. ПОПЕРАК—Рабочая кніга па матэматыцы, ч. I.
3. САГАЛОВІЧ—Рабочая кніга па матэматыцы, ч. II.
4. ЛЁСІК—Школькая граматыка. выд. 8-е.
5. САМКОВІЧ, ПРАТАСЭВІЧ і ГАРБАЦЭВІЧ—«Наш Сьцяг», выд. 5-е.
6. ДЗЯРЖЫНСКІ—Выпісы з беларускай літаратуры.
7. АСТРАБ—Курс дасьледчай гэомэтрыі.
8. САМКОВІЧ і ПРАТАСЭВІЧ—Родныя шляхі, ч. I, выд. 5-е.
9. ПЭЎЗНЭР—Сельска-гаспадарчая каапэрацыя (хрэстоматыя).
10. КАЛІНІЧЭНКА і МАЗУР—Чырвоная Зьмена, выд. 7-е.
11. РУДОМІНО—Грамадазнаўства для VI кл.
12. КЕРЖАНЦАЎ і ЛЕОНЦЬЕЎ—Азбука ленінізму.
13. Падручнік для комсамольскіх і вясковых політчытак.

БЕЛАРУСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ ВЫДАВЕЦТВУ

ПАТРЭБНЫ КАРЭКТАРЫ

для зьдзельнай карэктуры рукапісаў на БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ.

АПЛАТА 2 р. 50 к. АРКУШ.

Барысаўскі Райгарзагс выклікае гр. Саковіча Петра Антонава на 12-X г.г. па справе аб скасаваньні шлюбу згодна заявы гр-кі Саковіч Любы Івановай жых. у Н.-Барысаў.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Лекавая кніжка № 13945 Будзько В. Ф., выд. Мазыр. акр. аддз. аховы здар., кв. 516п.

— Вайсковы білет № 42 Будзько В. Ф., выд. Мазырскім ваенкаматам кв. 516п.

— Пасьведч. на права хаваньня зброі Усава Р. О., выд. Гомельскім ОГПУ, кв. 555п.

— Мэтрычны выпіс Казлоўскай Л. І., выд. Рэчыцкім загсам, кв. 555п.

АБ'ЯВА.

ІНВЭНТАРЫЗАЦЫЯ ў менскіх магазынах БЕЛПАЙТОРГУ будзе вытвараецца ў наступныя тэрміны.

МАГАЗЫН № 1 рог Ленінскай і Савецк. № 28-84 з 15-IX да 23-IX
МАГАЗЫН № 2 Неміга, рог Республік. з 22-IX да 3-X
МАГАЗЫН № 3 Школьная, 4 з 1-X да 8-X
МАГАЗЫН № 4 Ленінская вул. з 6-X да 14-X

Просім паклапаціцца заўчасна пакупкай тавараў, бо ў паказаныя дні тавары з